

# «БЕЛАРУСЬ ПАД ЧЫСТЫМ НЕБАМ — ГЭТА МЭТА ЎСЁЙ НАШАЙ ПАЛІТЫКІ»

**На ўрачыстым сходзе з нагоды Дня Незалежнасці Прэзідэнт гаварыў пра самае важнае**

(Працяг на стар. 2–5)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

2 ЛІПЕНЯ 2025 г. СЕРАДА № 126 (30514)

# НАШ ГАЛОЎНЫ ДЗЕНЬ




***Дарагія беларусы!***

*Віншую вас з Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Днём Рэспублікі) — святам, якое ўвасабляе ў сабе гераізм, працоўную доблесць і веру суверэннай і моцнай духам нацыі ў шчаслівую будучыню.*

*Дата вызвалення сталіцы Радзімы ад фашысцкага прыгнёту азнаменавала аднаўленне мірнага жыцця і назаўжды стала для беларусаў сімвалам барацьбы за свабоду, прыкладам мужнасці і нязгасным арыенцірам для новых пакаленняў.*

*Прымнажаючы спадчыну мінулага працай і талентамі сучаснікаў, адстойваючы спрадвечныя каштоўнасці і праўду, мы паслядоўна рухаемся да поспеху па шляху справядлівасці і стваральнай працы.*

*Перакананы, што памяць аб гераічным мінулым і дачыненне да агульнай справы, любоў да Айчыны і гонар за яе дасягненні дапамогуць нам зрабіць Беларусь шчаслівай і квітнеючай.*

*У гэты асаблівы дзень жадаю ўсім моцнага здароўя, міру і дабра.*

*Са святам, з Днём Рэспублікі!*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр Лукашэнка.**

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.



СВЯТОЧНАЯ «ЗВЯЗДА» 1945-ГА — У ЧЫРВОНЫМ І ЗОЛАЦЕ 8-9



БОЛЬШ ЗА ТРЫ СТАГОДДЗІ ПРАЦОЎНАГА СТАЖУ — НА «БЕЛАЗЕ» 10-11



АБ ЧЫМ МАРАЦЬ ВЫПУСКНІКІ ВНУ? 15



ІДЭІ ПЕРАЎТВАРЭННЯ СТАЛІЦЫ — У НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ 16

TikTok

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

ISSN 1990 — 763X

25126>

9 771990 763008

# «БЕЛАРУСЬ ПАД ЧЫСТЫМ НЕБАМ —

## Прэзідэнт выступіў на ўрачыстым сходзе

Дзень Незалежнасці — больш чым свята. Гэта яшчэ і падвядзенне вынікаў, аналіз таго вялікага шляху, які прайшла наша краіна. Гэта ўрокі мінулага, сучасныя дасягненні і планы на будучыню. Гэта наша гісторыя — такая, якая яна ёсць. Усё сказанае знайшло адлюстраванне ў прамове Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі на ўрачыстым сходзе, прысвечаным Дню Незалежнасці. Традыцыйнае мерапрыемства сабрала ў Палацы Рэспублікі беларусаў розных узростаў, прафесій, жыхароў усіх абласцей — тысячы людзей, аб'яднаных любоўю да сваёй краіны і зацікаўленых у яе росквіце.



Фота БелТА.

### «ПАМЯЦЬ АБ ПОДЗВІГУ — ПЫТАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ГОДНАСЦІ»

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што свята Дня Незалежнасці, якое мы ўрачыста адзначаем, мае для нас, беларусаў, фундаментальнае значэнне. «Незалежнасць — гэта свабоднае і мірнае жыццё, бяспека і ўпэўненасць у заўтрашнім дні, — падкрэсліў ён. — Так мы павінны разумець сваю незалежнасць».

Па словах кіраўніка дзяржавы, беларускі народ добра памятае, што значыць страціць усё гэта раптоўна. «І ведае, што значыць пакласці жыццё на алтар будучай роднай Айчыны, — дадаў Прэзідэнт. — У нашай гісторыі так было неадночы. Але дата вызвалення Мінска ад фашысцкай акупацыі — 3 ліпеня — стала мяжой. Мяжой духоўнага і грамадзянскага станаўлення нацыі, якая агнём і крывёй зацвердзілася ў сваім статусе».

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што Вялікая Айчынная вайна, самая бесчалавечная з усіх войнаў, перавярнула свядомасць усёй сусветнай супольнасці. «І тады здрыгануліся ўсе, — звярнуў увагу беларускі лідар. — Уварванне фашысцкай Германіі на тэрыторыю еўрапейскіх краін прымусіла жыхароў усіх кантынентаў задумацца аб каштоўнасці свабоды і крохкасці жыцця. У вачах усяго свету абрынуўся міф аб гарантыях бяспекі. Гарантыях, якія павінны былі забяспечваць ваенныя саюзы, кааліцыі, пакты аб ненападзенні і іншыя міжнародныя пагадненні... Слухайце, нібыта сёння (гэта адбываецца. — **«Зв.»**)...»

Прыклад толькі адной Беларусі, якая страціла за няпоўныя тры гады трэцюю частку насельніцтва, уключаючы самых слабых і безабаронных — жанчын, старых, дзяцей, як звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, падзяліў гісторыю на «да» і «пасля». «Ніякая гэта не вайна была на тэрыторыі Беларусі супраць нас. Гэта быў сапраўды генацыд, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Не толькі нашу гісторыю падзяліў. Усе, хто сачыў за бітвай стагоддзя, распачатай на подступах да Брэсцкай крэпасці, дзе быў дадзены першы дастойны адказ агрэсару, разумелі, што лёс свету будзе вырашацца тут, на ўсходнеславянскіх землях. І вырашаць яго будуць сілы нашай Чырвонай Арміі».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэты гістарычны факт — і наш боль, і наш гонар. «Мы працягваем гісторыю няскоранага народа, — сказаў беларускі лідар. — Памяць аб яго подзвігу — пытанне нацыянальнай годнасці, без якога размовы аб незалежнасці, суверэнітэце, свабодзе — проста словы. Мы ж абапіраемся на рэальны досвед і рэальныя дасягненні».

### «ПАМЯТАЕМ УСІХ, ХТО СТАЯЎ НАСМЕРЦЬ ЗА КОЖНУЮ ПЯДЗЮ НАШАЙ ЗЯМЛІ»

Прэзідэнт паставіў слушнае пытанне — колькі мы ведаем народаў, якія былі пастаўлены на мяжу поўнага знішчэння, падобна савецкаму народу, беларусам, але са зброяй у руках выстаялі? «Колькі такіх народаў? — акцэнтаваў увагу ён. — Колькі мы ведаем дзяржаў, якія гэтак жа гераічна, як мы, трымалі ўдар цэлай арміі нацысцкіх вайсковых фарміраванняў, сабраных з 30 краін Еўропы? Колькі такіх дзяржаў?»

Кіраўнік краіны нагадаў, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны ўдар трымалі байцы, партызаны, падпольшчыкі. «Змагаліся жанчыны, старыя, дзеці, — канстатаваў ён. — На роўных. Са зброяй у руках. Менавіта на нашай зямлі захопнікі сутыкнуліся з масавым і ўсебаковым супраціўленнем. Сталі сведкамі бяспрыкладнай смеласці нашых землякоў — моцных духам і нязломленых».

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка дадаў, што славу Перамогі над гітлераўскімі акупантамі мы, безумоўна, дзелім з былымі савецкімі рэспублікамі. «Інакш нельга, — сказаў Прэзідэнт. — Памятаем усіх, хто стаяў насмерць за кожную пядзю нашай зямлі. З належнай павагай ставімся да гісторыі краіны, якая перамагла фашысцкую Германію і яе сатэлітаў».

Па словах кіраўніка дзяржавы, і ў 1990-я гады беларусы свядома абралі шлях гістарычных пераемнікаў гэтай вялікай дзяржавы — СССР. «Мы не адмаўлялі і не перакрэслівалі нашу гісторыю, — удакладніў Прэзідэнт. — Панацце «братэрскія народы» для нас не фігура маўлення. Гэта спадчына, якую мы беражом».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што толькі ў нашай краіне Дзень Незалежнасці святкуецца нароўні з Днём Вялікай Перамогі. «Бо тады, у самы востры момант пераможнага наступлення Чырвонай Арміі, дзень вызвалення Мінска стаў прадвеснікам пераможнага 9 Мая, сімвалам адраджэння беларускай зямлі, ды і ўсяго савецкага народа, — патлумачыў ён. — Выбар даты нашага галоўнага дзяржаўнага свята гістарычна абгрунтаваны і прыняты сэрцам кожнага з нас, кожнага беларуса. У гэтым выбары — воля не толькі нас, сучаснікаў, якія не маглі паступіць інакш, але і нашых бацькоў і дзядоў».

Звяртаючыся да ветэранаў — і вайны, і працы (усяго пакалення), Прэзідэнт адзначыў, што яны вытрымалі неймаверны па сіле ўдар і выстаялі ў эпахальнай бітве. «Бітве за жыццё вашых дзяцей і ўнукаў, — удакладніў ён. — За наша жыццё і тых, хто прыйдзе пасля нас. Нізкі вам паклон! Ваша пакаленне здзейсніла подзвіг, роўнага якому ў гісторыі не было, няма. Ці будзе? Сёння мы разам з вамі зноў схіляем галовы ў памяць аб героях той вайны. Вечная слава, бязмерная падзяка скрозь стагоддзі ўсім, хто здзейсніў ваенны і працоўны подзвіг. Подзвіг, які стаў нашым маральным арыенцірам».

### «ПАЎТАРЭННЕ БЯДЫ, ЯК ВА УКРАІНЕ АБО, НЕ ДАЙ БОГ, НА БЛІЗКІМ УСХОДЗЕ, ДЛЯ НАС АБСАЛЮТНА НЕПРЫМАЛЬНА»

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што многія краіны свету сталі незалежнымі дзякуючы той Вялікай Перамозе. У многіх

## Даслоўна

**Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі:**



— Незалежнасць нашу трэба берагчы, адстойваць, дзякаваць за яе Богу. Кожны народ імкнецца да таго, каб жыць свабодна, рэалізоўваючы свае магчымасці так, як лічыць правільным, у адпаведнасці з той спадчынай папярэдніх пакаленняў, якая была перададзена, улічваючы культурныя і духоўныя традыцыі. Мы нямала сёння маем. Пытанне будучыні заўсёды таемнае, цяжка яе прадбачыць, але, думаецца, што калі мы будзем разам рабіць агульную справу на карысць дзяржавы, нашага народа, то будзе добрая, хоць і няпростая будучыня. Мы бачым, якія складаныя працэсы адбываюцца ў свеце. Важна, каб людзі добрай волі аб'ядноўваліся і каб духоўна-маральныя каштоўнасці беларускага народа, іншых народаў дапамагалі чалавецтву правільна будаваць сваю будучыню. Ад гэтага шмат што залежыць.

**Іван КУБРАКОЎ, міністр унутраных спраў:**



— Вакол нашых граніц абстаноўка вельмі напружаная. Але дзякуючы кіраўніку нашай дзяржавы нам удаецца захаваць гэты астравок бяспекі. Паглядзіце на бязвізавы рэжым: людзі з задавальненнем едуць да нас, таму што ведаюць пра якасць нашага жыцця, якасць нашых прадуктаў. І, самае галоўнае, яны ведаюць, што ў нас бяспечна: у любы час яны могуць смела хадзіць па вуліцах любога горада, любой вёскі. Так, ваенная бяспека — гэта вельмі важна. Але самае галоўнае — гэта эканамічная бяспека. У Беларусі працавітыя людзі. Нягледзячы на санкцыі, мы развіваемся, з'яўляюцца новыя прадпрыемствы — і не толькі ў Мінску і абласных гарадах, а ў кожным раёне. Мы як супрацоўнікі органаў унутраных спраў, ваенныя людзі рабілі і робім усё для таго, каб на нашай беларускай зямлі быў мір. Мы павінны захаваць незалежнасць нашай краіны. Калі мы будзем незалежныя, у нас усё будзе добра.

# ГЭТА МЭТА ЎСЁЙ НАШАЙ ПАЛІТЫКІ»

## з нагоды Дня Незалежнасці

народаў з'явілася магчымасць выбіраць уласны шлях развіцця.

«Нагадаю: незалежнасць каштуе дорага, вельмі дорага, — падкрэсліў Прэзідэнт. — І справа не толькі ў эканоміцы. Мы, беларусы, заплацілі за яе самую страшную цану. Таму ў кожным новым ваенным канфлікце, развязаным на планеце цяпер, мы бачым асабістую трагедыю, нам чуецца рэха Вялікай Айчыннай вайны. Мы вастрэй, чым хтонебудзь, рэагуем на падзеі, якія прымушаюць нас праводзіць гістарычныя паралелі. Паўтарэнне біды, як ва Украіне або, не дай бог, на Блізкім Усходзе, для нас абсалютна непрымальна. Перадумовы да падобнага развіцця падзей будзем спыняць на корані, калі, не дай бог, мы ўбачым гэта ў сябе, на нашай зямлі. Кажу гэта тым, хто стаіць за кожным падобным сцэнарыем».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што праз 80 гадоў пасля нашай Перамогі на змену Ялцінскаму міру прыйшла брусельска-вашынгтонская авантура. «Ачагі напружанасці распальваюцца наўпрост з кабінетаў заходніх чыноўнікаў, — удакладніў ён. — Гуляюць жыццямі людзей, як персанажамі камп'ютарнай гульні ці галівудскага фільма. Спытацца, навошта? Я хачу, каб вы разумелі. Кажу вам як чалавек па пасадзе такі ж, як яны, на Захадзе. Калі нешта праваліў тут, калі ты стварыў несусветнае... А паглядзіце, што адбываецца ў Францыі, Вялікабрытаніі, Германіі. Не ў тым (справа. — **«Зв.»**), што я нагнятаю абстаноўку. Там жа ўрады мяняюцца кожныя год-два. Гэта аб многім сведчыць. Значыць, у сябе натварылі і нехвастом хочуць замесці свае злачынствы, а праз удары па мірным насельніцтве, як гэта адбылося ў безабароннай Газе або пры нанясенні ўдараў па Іране. Удумайцеся толькі: з-за нейкай зноў прабіркі. У Іране знайшлі а-ля прабірку: «там ядзерная зброя заўтра будзе, значыць, трэба нанесці ўдар». Давайце падумаем: а хто даў права? Хто дазволіў? Чаму краіна, якая валодае ядзернай зброяй, павінна бамбіць такую ж краіну, якая няхай нават, можа быць, імкнецца да гэтага, каб сябе абараніць? Якое права яна мае бамбіць?»

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы заўважыў, што гэтага не адбылося б, каб «за спінай не стаялі моцныя свету ўсяго».

Прэзідэнт праінфармаваў, што Германія, амаль як у пачатку мінулага стагоддзя, з маўклівага заахвочвання заходніх партнёраў заяўляе аб стварэнні самай моцнай арміі Еўропы. «Не нагадвае гэта вам нічога? Што было сто гадоў таму, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Зноў прымярае на сябе ролю рэгіянальнага ваеннага лідара, размяшчаючы паблізу нашых граніц злучэнні сухапутных войскаў брыгаднага ўзроўню. І не верце вы гэтым размовам. Зноў амерыканцам на перагаворах я сказаў: «Мы вам не верым». Што адбываецца сёння ў свеце: Трамп кажа адно, а яны, у Еўропе, робяць іншае. Гэту кашу заварылі. Людзі, нават палітыкі, не паспяваюць за гэтым сачыць. Усё гэта — сцэнарый. Так, у Трампа ёсць крыўда на Еўропу: за Байдэна ішлі сцяной, а перамог Трамп. Так, у яго ёсць крыўда. Ён чалавек, які не змог змірыцца з гэтай крыўдай, хоць любы палітык павінен быў перакрэсліць мінулае і пачаць будаваць цяперашняе. Дык вось іх цяперашняе — яны як былі разам, так і ёсць. Толькі ў гэтым «спектаклі» разыгрываюць розныя ролі».

У гэтай сувязі Прэзідэнт заклікаў не супакойвацца і не думаць, што надта нешта змянілася. Іран, па яго словах, гэта паказаў. З аднаго боку, Дональд Трамп — міратворац, які хоча скончыць вайну ва Украіне, а з другога — адбываецца нанясенне абсалютна незаконнага ўдару па Іране.

«Кітайская Народная Рэспубліка, старажытная цывілізацыя, дакладна вызначае, што, напэўна, самы галоўны і небяспечны працаўнік для нас, самая небяспечная краіна-дзяржава — гэта Германія, — канстатаваў беларускі лідар. — Вось яно пацвярджаецца. Яны ствараюць армію. Калісьці ў свеце мы абмяжоўвалі Германію. Да чаго гэта прывяло? Да новай — Другой сусветнай — вайны. Абмежавалі. А што сёння? Тармазоў няма, толькі наперад».




Фота БелТА.

### «НЕ СПЯШАЙЦЕСЯ ДАВАЦЬ АЦЭНКІ, ЧАС РАССТАВІЦЬ УСЁ НА СВАЕ МЕСЦЫ»

Літва і Польшча, як звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, старанна акопваюцца, польская ўлада па ўсім свеце скупляе ваенную тэхніку. «Усе выдаткі — за кошт падаткаў сваіх грамадзян і тых крэдытаў, хто іх дае (амерыканцы або па іх указцы), — заўважыў беларускі лідар. — Так што ж памяняласся? Кідаюцца ў новыя ваенныя саюзы, па сутнасці, варожыя ў адносінах да нас. Звярніце ўвагу: Францыя і Польшча падпісалі дагавор, які прадугледжвае паглыбленае супрацоўніцтва ў ваеннай сферы. Аналагічны Польшча планує заключыць найбліжэйшым часам з Вялікабрытаніяй — на ўсялякі выпадак з дзвюма ядзернымі дзяржавамі».

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ніхто не хоча ўспамінаць, чым скончыўся паход на ўсход, як цяпер модна казаць, «гітлераўскага Еўрасаюза». «Таму Польшча і краіны Балтыі дазваляюць ператвараць сябе ў чарговы пасля Украіны ваенны палігон, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Ні ў якім іншым статусе нашы найбліжэйшыя суседзі Захаду абсалютна не цікавыя. Што, Германія, ствараючы армію, хоча ваяваць на сваёй зямлі? Не. Вы бачыце, як ва Украіне — проксі-вайна. Дакладна так яны хочуць ваяваць супраць нас, у тым ліку супраць Украіны, славянскіх народаў — мы заўсёды ім папярок горла. Яны хочуць ваяваць на чужой зямлі. У гэтым выпадку Літва, Латвія, Эстонія і Польшча».

Так што ні ў якім іншым статусе, як акцэнтаваў увагу беларускі лідар, гэтыя дзяржавы Захаду не патрэбныя, не цікавыя. «Калі хочуць чарговы раз знікнуць з карты свету — гэта будзе іх выбар!» — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт нагадаў, што спыніць братазабойчую вайну, распачатую ва Украіне пасля дзяржаўнага перавароту, Беларусь заклікала яшчэ ў 2015 годзе. «На Саміце ААН па ўстойлівым развіцці ад імя нашага народа і дзяржавы я папярэджваў, што горача будзе ўсяму цывілізаванаму свету і мы яшчэ не ведаем, што будзе, калі не спынімся, — згадаў свае словы кіраўнік дзяржавы. — Вы бачыце: уцягнулі ва ўкраінскі канфлікт усіх, каго толькі можна. І зноў — сцэнарый, зноў — спектакль. Быццам бы міратворац з-за акіяна адышоў, ён жа супраць гэтай вайны, ён хоча яе спыніць. А вось гэтыя дурні (Захад), яны хочуць вайны. Кіньце вы, мы гэта ўсё бачылі. Ролі размеркаваны. Прэзідэнт ЗША правільна зрэагаваў. У пэўным сэнсе правільна. Гэта ваша вайна ў Еўропе — ваюйце. Але гэта не значыць, што яны па-за гульнёй. Яны зноў там, у цені. Яны думаюць, што схаваюцца ў сучасным свеце за акіянам».

На фоне гэтага канфлікту, па словах Прэзідэнта, зацягнулі ў Паўночнаатлантычны альянс Фінляндыю і нават Швецыю, якая на працягу двух апошніх стагоддзяў заставалася нейтральнай. «Мы ўжо назіраем, як палае Блізкі Усход, — дадаў беларускі лідар. — Свет яшчэ не ачуняў ад жудасных кадраў ізраільска-палесцінскай бойні, дзе хочуць на касцях (удумайцеся!) стварыць нейкую крутую базу адпачынку або курорт. На касцях людзей, дзяцей! Не паспелі ад гэтага адысці, як бомбы ўжо ляцяць на іранскія гарады».

І дзе, пацікавіўся кіраўнік дзяржавы, так званыя міжнародныя праваабаронцы, якія клапоцяцца аб выкананні дэмакратычных правоў і свабод? «Іх не чуваць», — канстатаваў беларускі лідар, нагадаўшы, што зусім іншая сітуацыя была ў адносінах да Беларусі ў 2020 годзе і пасля яго.

«Я, памятаеце, вам казаў: не спяшайцеся даваць ацэнкі, час расставіць усё на свае месцы, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Вось ён і расставіў. Мы бачым сапраўдную праўду і бачым іх твар. І цэнім тое, што адбылося ў 2020 годзе. Цэнім тое, што мы спынілі гэту мярзоту, якая спрабавала здзейсніць у нас мяцеж, што меў бы наступствы значна мацнейшыя, чым у нашай братняй Украіне».

### «МЫ НЕ МОЖАМ САБЕ ДАЗВОЛІЦЬ СОРАК ПЕРШЫ ГОД»

Прэзідэнт звярнуў увагу, што належнай рэакцыі наднацыянальных інстытутаў, якія прэтэндуюць на ролю гарантаў глабальнай бяспекі, няма. Але ёсць дакладнае разуменне сітуацыі ў нашай краіне, стратэгіі развіцця ў гэтых умовах.

«Як краіна — заснавальніца Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (думаю, вы гэта памятаеце), якая найбольш пацярпела ў той далёкай вайне і аказала гераічнае супраціўленне агрэсару, мы не можам сабе дазволіць ігнараваць новы віток эскалацыі планетарнага маштабу, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Пры ўсіх рызыках, пагрозах, пры ўсіх нападках на Беларусь мы паслядоўна прытрымліваемся прынцыпаў міралюбівай знешняй палітыкі. Нашы ініцыятывы па запуску глабальнага дыялогу па бяспецы — крокі, якіх вельмі чакаюць людзі. На ўсіх кантынентах. Чакаюць і ад сваіх палітыкаў».

*(Заканчэнне на 4–5-й стар.)*

**Андрэй ІВАНЕЦ, міністр адукацыі:**



— Дзень Незалежнасці — гэта адно з найважнейшых дзяржаўных свят, таму што яно прымеркавана да той падзеі, якую павінен памятаць кожны беларус. Сёлета мы адзначаем 81-ю гадавіну вызвалення нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Самае галоўнае, вядома, тое, што мы жывём пад мірным небам. І, упэўнены, гэта для кожнага чалавека, які пражывае ў нашай краіне, — найвялікшая каштоўнасць. Беларусь сёння — незалежная суверэнная дзяржава, мы развіваем нашу эканоміку, сацыяльную сферу, ствараем усе неабходныя ўмовы для таго, каб кожны адчуваў сябе тут камфортна.

**Уладзімір КАРАНІК, старшыня Прэзідыума НАН Беларусі:**



— Дзень Незалежнасці — гэта цудоўнае свята, не толькі магчымасць азірнуцца назад і ацаніць, які шлях мы прайшлі, але і сказаць «дзякуй» нашаму працавітаму народу, мудраму кіраўніцтву і лёсу за тое, што мы здолелі захаваць мір і стабільнасць на нашай зямлі. Галоўнае — пачуццё яднання, якое ўзнікае ў гэтае свята, калі людзі螺 рознага ўзросту, веравызнання, нацыянальнасцяў адчуваюць сябе разам грамадзянамі незалежнай Рэспублікі Беларусь. І вось менавіта гэта — залог міру, стабільнасці і далейшага развіцця. Я ўпэўнены, што пакуль мы адзіныя, разам з аптымізмам глядзім у будучыню, мы пераадолеем любыя складанасці.

**Аляксандр СУБОЦІН, старшыня Віцебскага аблвыканкама:**



— Мы ганарымся тым, што ў нас вакол спакойна, што дзеці ходзяць у школу, іх не трэба суправаджаць. Тым, што ў нас смачныя прадукты ў крамах. З гэтых дробязяў і складаецца шчасце, якое мы часам не адчуваем, а яно на самай справе ёсць. Гэта ўсё — плён нашай незалежнасці, цяжкай працы. Мы самі гэта зрабілі. Мы не баімся працаваць. Наш самы вялікі страх — падвесці адзін аднаго, краіну. І гэты страх прымушае рухацца яшчэ хутчэй.

# «БЕЛАРУСЬ ПАД ЧЫСТЫМ НЕБАМ — ГЭТА МЭТА

***(Заканчэнне. Пачатак на 2–3-й стар.)***

Беларускі лідар канстатаваў, што меры, якія прымаюцца па ўмацаванні абараназдольнасці дзяржавы, — не больш чым люстраны адказ на варожую рыторыку і неадэкватную колькасць баявога патэнцыялу паблізу нашых граніц. «Мы па-ранейшаму нікому не пагражаем — ні словам, ні справай — нягледзячы на правакацыі, — сказаў Прэзідэнт. — Але мы не можам сабе дазволіць сорак першы год».

Кіраўнік дзяржавы ўжо не раз звяртаў увагу на высокіх сходах, што калі б тады не ўлагоджвалі ледзь не сяброў з Германіі, то не мелі б такіх наступстваў. «Вы павінны разумець (і гэта вайна сучасная паказвае): наступаць, заваёўваць тэрыторыі чужых дзяржаў — забойна, — падкрэсліў ён. — Тады было яшчэ больш забойна, але мы не былі гатовы. Але чамусьці амаль за некалькі месяцаў да вайны пачалі рамантаваць аэрадромы, сцягнулі ўсю авіяцыю на адзін аэрадром. І авіяцыя была знішчана пры першым жа налёце фашысцкай авіяцыі. Мы прашлёпалі, пагранічнікі прапусцілі на нашу тэрыторыю дыверсійныя групы фашыстаў, якія перабілі ўсіх, хто ахоўваў стратэгічныя аб'екты, у тым ліку масты. Пераапрануліся ў адзенне савецкіх войнаў і ўжо ў глыбокім тыле ваявалі супраць нас. Гэта ўсё было тут, на тэрыторыі Беларусі».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што гэтыя гістарычныя факты, якія ён прывёў, з'яўляюцца для нас урокам. «Таму нельга расслабляцца, — акцэнтаваў увагу беларускі лідар. — Кожны дзень, кожную гадзіну мы павінны рыхтавацца да вайны, каб яе пазбегнуць. Зразумейце: каб яе пазбегнуць, а не ваяваць».

### «РОБІМ УСЁ, КАБ ЗМЕНШЫЦЬ НАПРУЖАНАСЦЬ У РЭГІЁНЕ»

Прэзідэнт праінфармаваў, што побач з Беларуссю праводзіцца серыя вучэнняў «Абаронца Еўропы — 2025». «Ад каго абараняецеся? — задаў рытарычнае пытанне кіраўнік дзяржавы. — Маштаб і блізкасць манеўраў пагрозлівыя: 25 тысяч ваеннаслужачых НАТА (гэта як яны заявілі, дакладную лічбу ніхто не заяўляе, заўсёды больш) і каля трох тысяч адзінак узбраенняў і тэхнікі літаральна за 10-15 кіламетраў ад нашай граніцы. Гэта нават не адлегласць аднаго кідка сучаснай тэхнікі. Гэта ўжо фактычна на нашай зямлі. Мы бачым гэтых «абаронцаў» з наступальным сцэнарыем ва ўсёй красе. І не збіраемся рэагаваць на агрэсіўную дэманстрацыю сілы. Робім усё, каб зменшыць напружанасць у рэгіёне».

Таму, па словах Галоўнакамандуючага, было прынята рашэнне змяніць параметры вучэнняў узброеных сіл Саюзнай дзяржавы «Захад-2025». «Мы знізілі колькасць войскаў практычна ўдвая, перанеслі месца іх размяшчэння ўглыб сваёй тэрыторыі, падалей ад граніцы на сотні кіламетраў, на палігоны, — канкрэтызаваў Аляксандр Лукашэнка. — Заклапочаныя амерыканцы на апошніх перагаворах з намі... Я ім прама сказаў: «Нічога не хаваем». Мы з Прэзідэнтам Расіі абмяркоўвалі гэтую тэму. Вы хочаце — калі ласка, я вас запрашаю ў Беларусь на гэтыя вучэнні. Калі ласка, глядзіце. Мы ні на кога не збіраемся нападаць. Тады чаму лямантуюць, што «вось яны заўтра нападуць, Еўропу захопяць»? Ім жа трэба абгрунтаваць сваю палітыку. Таму яны шукаюць ворага. І бачаць гэтага ворага ў нас».

Па словах Прэзідэнта, самая галоўная зброя, якая стрымлівае спробы нават думаць у бок нашай граніц, — адданасць інтарэсам Беларусі. «Усіх і кожнага!» — акцэнтаваў ён увагу. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што гарантыі нашай незалежнасці — уменне працаваць на сумленне на карысць сваёй сям'і і краіны, беражлівыя адносіны да гістарычнай памяці, традыцый і спрадвечных каштоўнасцяў.

Прэзідэнт адказаў тым, хто не лічыць важным адзначаць Дзень Перамогі і Дзень Незалежнасці, згадваць загінулых. «Так, нам, магчыма, па форме трэба неяк па-іншаму святкаваць, шанаваць памяць, можа быць,




Фота БелТА.

# «У МЯНЕ НЯМА НІЧОГА АСАБІСТАГА, АКРАМЯ

**Па традыцыі на ўрачыстых сходах Аляксандр Лукашэнка адказвае на пытанні, якія сёння больш за ўсё хвалююць наша грамадства. Не ў якасці палітінфармацыі ці прэс-канферэнцыі, а прама і адкрыта, за рамкамі афіцыйнага выступлення. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што сочыць за тым, што людзі абмяркоўваюць у інтэрнэце, таму вырашыў праліць святло на тэмы, якія не заўсёды правільна ўспрымаюцца, але трывожаць беларусаў.**

### «ЗНАЧЫЦЬ, ПАВАЖАЮЦЬ ПУНКТ ГЛЕДЖАННЯ»

Першая тэма — перагаворы з прадстаўнікамі Злучаных Штатаў Амерыкі. «Хачу, каб вы разумелі: я ніколі не грэбаваў размаўляць з людзьмі, як у нас дыпламаты кажуць, «не роўных самому сабе». Не важна, хто, вельмі важна, што людзі да цябе прыязджаюць і хочуць з табой размаўляць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў увагу, што пасля 2020 года на Захадзе ў яго адрас нават не ўжывалі слова «прэзідэнт», а сёння высветлілі, што ў Беларусі, аказваецца, ёсць Прэзідэнт і з ім трэба размаўляць, таму што ад імя беларускага народа ён нешта вызначае.

Кіраўнік дзяржавы расказаў, што ініцыявалі гэтыя перагаворы амерыканцы. І гэта далёка не першая сустрэча. Беларускі лідар размаўляў з прафесіяналамі, якія складаюць нарматыўна-прававыя дакументы, прадстаўляюць іх лідарам, пераконваюць іх па розных важных пытаннях — такія спецыялісты ёсць у кожнай дзяржаве. Адна з сустрэч Прэзідэнта, як вядома, адбылася са спецыяльным пасланнікам Дональда Трампа Кітам Келагам, які адказвае за Украіну.

Па словах кіраўніка дзяржавы, перш за ўсё гаварылі аб сітуацыі ў свеце. «Я не хачу тут быць нейкім зазнайкам, але тое, што з вашым Прэзідэнтам абмяркоўваюць абстаноўку ў свеце, — ужо нядрэнна. Значыць, паважаюць пункт гледжання», — адзначыў беларускі лідар. Ён растлумачыў, для чаго звярнуў на гэта ўвагу: «Я чалавек адказны. І вы зусім не разумееце, калі мяне дзесьці залішне ці нават не залішне падтрымліваеце, захвальваеце і іншае. Я наогул не люблю ліслівасць і хвальбу. Для мяне гэта найбольшы цяжар, які я нясу. Я страшна баюся вас падвесці. Вось сёння чалавек цябе падтрымаў, добрае слова табе сказаў. А ты заўтра зрабіў не так, як ён чакаў... Здавалася б, столькі гадоў працуючы на гэтай пасадзе, можна было неяк адысці і нешта забыцца (гэта часта бывае). Не. Я не забыўся. Я не забыўся, адкуль я. Я не забыўся, што я павінен зрабіць. І, паверце, для мяне самае галоўнае — вас не падвесці, каб потым вы расчаравана не разводзілі рукамі і не казалі, што памыліліся ў гэтым чалавеку. Гэта для мяне закон».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што менавіта з гэтай прычыны ўсе свае перагаворы і размовы ён не ўтойвае. «У мяне няма нічога асабістага, акрамя нашай дзяржавы, акрамя нашага народа. Таму што я першы. За мной будуць іншыя, і яны будуць абавязкова глядзець, як працаваў ты. І, робячы сёння нешта ад вашага імя, я думаю пра тое, каб і потым пасля мяне сапраўды так людзі паступалі: бераглі памяць, бераглі людзей, працавалі, імкнуліся накарміць і апрануць людзей і гэтак далей», — прызнаўся Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы расказаў, што менавіта з гэтых пазіцый ён вёў перагаворы з ЗША. Ён звярнуў увагу, што ніхто не перад кім не нізкапаклоннічаў, як гэта кажа адзін са збеглых. Дарэчы, акцэнтаваў Аляксандр Лукашэнка, за гэтага чалавека амерыканцы не прасілі: «Яны яго лічаць прарасійскім. Адмазацца ад гэтага яму будзе складана. Мы ж памоўчваем яшчэ, вы ж разумееце, што фактаў у нас дастаткова. Гасподзь з ім, хай жыве. Мы не ўмешваемся ў сямейнае жыццё, катэгарычна забараніў людзям, якія штосьці ведаюць, умешвацца ў асабістае жыццё. Мы павінны быць вышэй усякай гэтай дурноты».

Аляксандр Лукашэнка адказаў і на размовы з разраду «вось Трамп скажа — і ён пабяжыць, ён выпусціць». «Як толькі Трамп асмеліцца сказаць хоць адно слова — усякія размовы з амерыканцамі спыняцца. Мы вядзём годна размову з людзьмі і ім часта кажам: «Калі нешта ў нас не так, вы ж былі ініцыятарамі гэтага, вы ж гэтага хацелі, — заявіў беларускі лідар. — Якія перагаворы могуць быць з людзьмі, якія ўвялі супраць нас шалёныя санкцыі, развязалі супраць нас вайну. Перш за ўсё эканамічную вайну, вайну на знішчэнне». Па словах кіраўніка дзяржавы, амерыканцы такую пазіцыю не адмаўляюць, разумеюць, у чым зацікаўлены беларускі бок.

### «Я НЕ ВЕРУ, ШТО ЯНЫ ХОЧУЦЬ СПЫНІЦЬ ГЭТУ ВАЙНУ»

Беларускі лідар параіў тым, хто ацэньвае яго дзеянні, не спяшацца. Па-першае, пройдзе час, і ён усё расставіць на свае месцы. Па-другое, таму што не ўсё можна агучваць публічна, гэта няправільна. Аляксандр Лукашэнка іранічна заўважыў: магчыма, у вялікіх дзяржавах так і трэба, што прэзідэнт раніцай кажа адно, а ўвечары робіць іншае. «Мяне гэта здзіўляе. Сапраўды так я амерыканцам гэта казаў і дадаў: «Яшчэ вы так папіярыцеся ў сродках масавай інфармацыі — амерыканцы вас выкінуць на вуліцу», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён распавёў, што папярэдзіў амерыканскую дэлегацыю аб тым, што, калі цяперашняя ўлада будзе казаць адно, а рабіць іншае — гэта вельмі падарве іх аўтарытэт і апусціць уніз. «А я б не хацеў, каб Трамп прайграў і гэтыя людзі. Яны яшчэ, па-мойму, не адышлі ад перадвыбарнай вакханаліі. Я ім таксама пра гэта сказаў. Час адыходзіць і пачынаць займацца канкрэтнай справай. З гэтых пазіцый ішлі перагаворы і па Украіне ў тым ліку», — паведаміў кіраўнік дзяржавы. Ён звярнуў увагу, што амерыканцы цяпер настойваюць на перамір'і хоць бы ў паветры. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што раней ужо абмяркоўваў гэта з Уладзімірам Пуціным. З яго слоў, расійскі бок гэтак жа зацікаўлены ў перамір'і, але пры ўмове, што і Украіна спыніць удары па Расіі.

Беларускі лідар расказаў, што і гэтую пазіцыю данёс да амерыканцаў. Тыя абяцалі папрацаваць у гэтым кірунку. «Гэта будзе добры першы крок да спынення гэтай братазабойчай вайны. Але я не веру, што яны хочуць спыніць гэтую вайну», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка таксама расказаў, што на перагаворах абмяркоўвалі сітуацыю ў Іране і на Блізкім Усходзе. Ён адзначыў, што данёс тую ж пазіцыю, пра якую казаў раней. «Ніякай гульні ў паддаўкі, паважаныя сябры, не было. Была годная размова», — рэзюмаваў беларускі лідар. Ды і, звярнуў увагу ён, гульня ў паддаўкі ў прынцыпе нічога нам даць не можа, таму яна была недарэчная. «Мы не поўзаем, не вымольваем нічога. Мы здольныя пракарміць сябе самі. Мы яшчэ не развучыліся працаваць», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

### «ГЭТА ЗЛАЧЫНЦЫ. АЛЕ ГЭТА ЛЮДЗІ»

Паводле слоў Прэзідэнта, нямала часу надалі тэме так званых палітвязняў. «На што я чарговы раз заўважыў, што, калі вы будзеце казаць пра палітвязняў, мы з вамі перастанем весці размову. Асабліва пасля Блізкага Усходу, дзе вы разграмілі, разбамбілі, забілі людзей, дзяцей — дзясяткі тысяч сцерлі з твару зямлі. Пра якіх палітвязняў? Дзе вы няправільна паступілі?» — сказаў ён. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, амерыканцы такую пазіцыю прынялі.

# ЎСЁЙ НАШАЙ ПАЛІТЫКІ»

мы аб гэтым падумаем, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Але забываць пра гэта нельга. Слухайце, мы дарослыя людзі, у нас гэта ў крыві. Нам убілі ў мазгі гэта са школы, са школьнай лаўкі. А моладзь? Яны павінны памятаць. Гэта ж вялікі набытак народа, які перамог у такой страшнай бойні мінулага стагоддзя. Гэта самае галоўнае, каб не дапусціць, каб гэта зноў адбылося. Вось чаму мы шмат кажам, але, можа, па старой форме неяк падыходзім да святкавання гэтых дат. Падумаем. Але забываць ні ў якім разе нельга. Я ўжо вас у Хатыні папярэджваў: як толькі забудзем дарогу ў Хатынь — усё, назад гэта вернецца. Давайце не будзем пра гэта забываць».

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што мы ўважліва назіраем, адэкватна ацэньваем рызыкі і ўласныя магчымасці. «Мы ж не крычым, што заўтра будзем нападаць, абараняцца і гэтак далей, — патлумачыў кіраўнік дзяржавы. — Вы ж разумееце, што ў адзіночку супраць аграмадзіны Еўрасаюза, НАТА, у якім, можа, каля мільярда чалавек разам са Злучанымі Штатамі... Мы што, выстаім у адзіночку? Ніколі. Вось вам адказ, чаму мы побач з брацкай Расіяй. Скажыце, а з кім? Тыя, хто мяне за гэта крытыкуе, назавіце краіну, з кім мы можам разам адстойваць нашы інтарэсы? З кім мы размаўляем на адной мове? І мы павінны цаніць гэта і быць побач».

## «МЫ РОБІМ УСЁ, КАБ МІРАМ АПЛАЦІЦЬ ДОЎГ ПЕРАД ПАКАЛЕННЕМ ПЕРАМОЖЦАЎ»

Па словах Прэзідэнта, Беларусь уважліва назірае за тым, што адбываецца ў свеце, і працягвае героічны шлях сваіх продкаў. «У нас шмат планаў на жыццё, — заўважыў ён. — Простых, асабістых, важных для усёй краіны. Нядаўна правялі выпускныя балі. Пачалася ўступная кампанія. Вы бачылі, што на самым высокім узроўні мы назіраем, як яна адбываецца і адбываецца. Нашы дзеці рыхтуюцца зрабіць лёсавызначальны крок у дарослае жыццё, бацькі хвалююцца. Я і многія іншыя на гэта рэагуем, разумеем, што гэта ваша жыццё. Гэта не бульба, якая дзесьці там на складах згубілася. Гэта будучыня самых адукаваных, самых адораных, мэтанакіраваных людзей — будучых будаўнікоў нашага жыцця, нашых дзяцей».

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што цяпер гарачая пара ў аграрыяў. Па яго словах, нашы працаўнікі вёскі актыўна працуюць на рэзультат, вынікі будуць падведзены падчас свята «Дажынак». Звяртаючыся да беларускага народа, Аляксандр Лукашэнка папрасіў не быць у баку ад гэтых спраў. Ён нагадаў пра тэндэнцыю ад'езду людзей з сельскіх населеных пунктаў у гарады і параіў не забываць пра тое, што вёска сёння корміць і апранае насельніцтва.

«Пастаўлена галоўная задача — накарміць краіну і зарабіць», — акцэнтаваў увагу беларускі лідар.

Пералічваючы справы надзённыя, Прэзідэнт нагадаў, што не за гарамі і любімыя летнія фестывалі. «У Александрыі, Віцебску збярэцца ўся краіна, да нас прыедуць сябры з блізкага і далёкага замежжа, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Хто бачыць у гэтых планах іншыя, не мірныя мэты? Мы святкуем Дзень Незалежнасці пад чыстым небам і вельмі-вельмі гэта цэнім. Мы робім усё, каб мірам аплаціць доўг перад пакаленнем пераможцаў, якія падарылі нам 80 гадоў гэтага мірнага жыцця. Робім усё, каб апраўдаць іх надзеі. У іншым выпадку, яны за што гінулі? Мы ж усе дакладна разумеем, што яны там, на нябёсах, бачаць, чым мы займаемся. Мы таксама там будзем усе і будзем бачыць, як будуць жыць і працаваць нашы дзеці і ўнукі».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь пад чыстым небам — гэта і мэта ўсёй нашай палітыкі, і вобраз будучыні, да якой імкнёмся. «Галоўнае, што, мы, на жаль, не можам купіць, — гэта наша здароўе, — дадаў ён. — Таму здароўя вам, шчасця і дабрабыту. Беражыце сябе! Беражыце свае сем'і! А заадно беражыце нашу родную Беларусь, нашу зямлю! Са святам! З Днём Незалежнасці!»

# НАШАЙ ДЗЯРЖАВЫ»

«Чаму іх цікавяць тыя, хто ў нас, парушыўшы закон, знаходзіцца ў месцах зняволення? Для мяне гэта балюча. Можа быць, хтосьці пагаварыў і забыўся, а для мяне гэта боль. Я гэтую праблему павінен вырашыць. Як? Толькі ў вашых інтарэсах», — адзначыў ён. Кіраўнік дзяржавы запэўніў, што ніколі не пойдзе супраць меркавання народа і супраць меркавання сілавікоў, якія тады прынялі ўдар на сябе. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што былі і тыя, хто асуджаў яго рашэнні адпусціць асуджаных. Але, паводле яго, да гэтых людзей трэба ставіцца па-чалавечы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што, прымаючы рашэнне аб вызваленні Сяргея Ціханоўскага, думаў пра яго сям'ю, дзяцей, жонку, якая «пяць гадоў галасіла». І звярнуў увагу, што яго слёзы на прэс-канферэнцыі пасля вызвалення былі падрыхтаваныя, зразумела, з чыёй дапамогай. Кіраўнік дзяржавы таксама нагадаў, што менавіта беларускія сілавікі пяць гадоў таму вывазілі Святлану Ціханоўскую ад замаху, арганізаванага «паплечнікам, які хацеў быць адзіным лідарам апазіцыі», яны ж вывезлі яе за мяжу.

«Як некаторыя крычаць: «Дарма, трэба, каб здохлі». Гэта не мая мэта. Гэта дрэнныя людзі, гэта злачынцы. Але гэта людзі. Я заўсёды шукаю выйсце, каб нам не было горш і каб ім добра было, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Таму перш чым разважаць, асуджаць і гэтак далей, вы заўсёды задавайце пытанне: «А якая мэта, для чаго, навошта?». Тут палітыка. Яна не заўсёды павінна быць прамалінейнай, трэба часам уціхамірыцца, падумаць пра мэту, пра будучыню. Пра нашу дзяржаву».

Па словах Прэзідэнта, варта памятаць, што гэтыя людзі не змяніліся. І ўсім вядома, хто ім плаціць грошы. Як вядома, і для чаго іх плацяць. Тут, паводле яго слоў, нічога не змянілася. «У гэтым хітраспляценні палітычным трэба выстаяць, утрымацца і ні ў якім разе не падставіцца, абараняючы свае інтарэсы», — рэзюмаваў беларускі лідар. Ён дадаў, што гэтыя людзі ў поле зроку і на кантролі. «Мы гуманна паставіліся да іх, але вельмі сур'ёзна кантралюем. Не перанапружваем наша грамадства, але часам паказваем, хто яны і як працуюць спецслужбы беларускія супраць гэтай усякай дрэні».

## «АРЭШНІКУ НА БЕЛАРУСКАЙ ЗЯМЛІ БЫЦЬ»

Яшчэ адна тэма, якая гучыць, — ядзерная зброя і асабліва «Арэшнік». Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што разумее тых, хто кажа: размяшчэннем у сябе ядзернай зброі Беларусь паставіла сябе пад удар. «А назавіце ў гісторыі ці нават цяпер, хто марыць пра гэта — напасці на краіну, якая валодае ядзернай зброяй? Гэта не для вас, каб пацешыць. Я не хачу, каб на вас і на маю краіну, як раней, хтосьці нападаў. І прадстаўнікам Злучаных Штатаў Амерыкі прама ў лоб даслоўна сказаў: «Ядзерная зброя, дзе трэба, ціха, спакойна існуе, ахоўваецца, як належыць у свеце. Але барані вас Гасподзь ступіць на нашу зямлю без нашага ведама — адказ будзе імгненны, вокамгненны і гэтай самай зброяй, якой вы больш за ўсё баіцеся», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што па дамоўленасці з Уладзімірам Пуціным першыя пазіцыі «Арэшніка» ў Беларусі будуць. Паводле яго слоў, да канца года гэтая зброя будзе размешчана ў Беларусі. «Тады не трэба будзе нікому баяцца, што беларусы, валодаючы ядзернай зброяй, гатовыя нанесці ўдар. Натуральна, што ўдар будзе нанесены не ядзернай зброяй», — рэзюмаваў ён.

«Я сумленны перад вамі. Я вам кажу так, як будзе, пакуль я Прэзідэнт. Выберыце іншага, можа, у вас будзе іншая палітыка. Але я буду рабіць усё, каб тут была самая сучасная зброя, разумеючы, што не ракеты сёння, не беспілотнікі вырашаюць лёс у баі і на фронце. Салдат і яго камандзіры. Яны — галоўная наша сіла», — дадаў Прэзідэнт. Ён адзначыў, што акцэнт робіцца на тое, што патрэбна нам і што можна ў нас ужываць. Напрыклад, на нашай лясіста-балоцістай мясцовасці прымяняць тыя ж беспілотнікі будзе дастаткова праблематычна. Але яны ў нас ёсць, распрацаваны айчынныя ўзоры, развіваецца гэты від войскаў. Аднак, зрабіў акцэнт кіраўнік дзяржавы, не трэба кідацца ў крайнасці. А тое, што расійскія партнёры дапамаглі з «Арэшнікам», дарагога варта. «Таму «Арэшніку» на зямлі беларускай быць, каб не дапусціць мяцяжоў», — сказаў Прэзідэнт.

## ВЫРАШАЦЬ ПЫТАННІ АД ЗЯМЛІ

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў курсе ўсяго, што цяпер хвалюе людзей, пачынаючы з самых элементарных пытанняў. «Я ўсё бачу і чытаю. Толькі вас прашу: не перагружайце мяне пытаннямі, якія там, на месцы, трэба вырашаць і якія ніхто не павінен вырашаць, акрамя вас. Але я чытаю гэта ўсё, раблю адпаведныя высновы. З гэтага ўся мая палітыка — вырашаць пытанні ад зямлі», — адзначыў напрыканцы беларускі лідар.

**Валерыя СЦЯЦКО, Вераніка КАНЮТА, Яна ВАЛАСАЧ.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», ул. Немига, 40, пом. 46, офис 2, г. Минск, 220004. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Могилевоблресурсы». 212040, г. Могилев, ул. Залуцкого, 23. УНП 700010221 |
| **Оператор ЭТП/ Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», ул. Немига, 40, пом. 46, офис 1, г. Минск, 220004. **www.ipmtorgi.by** |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Магазин 491,0 кв. м** (здание специализированное розничной торговли, 702/С-9342, составные части и принадлежности: пристройка, навес), **уборная 0,9 кв. м** (здание неустановленного назначения, 702/С-10349, составные части и принадлежности: асфальтобетонное покрытие, заборы, двое ворот). Адрес: **Могилевская обл., Быховский р-н, г. Быхов, ул. Советская, 77.** ***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,2138** га предоставлен на праве постоянного пользования для размещения объектов розничной торговли | |
| **Начальная цена лота с НДС 20 % – 115 200,00 бел. руб.** Шаг аукциона: 5 % от начальной цены | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение **10 (десяти)** календарных дней после подписания договора купли-продажи | |
| Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by). Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» на площадке. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **4 %** от цены продажи лотов в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 05.08.2025.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 04.08.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by | |
| **Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 29-154-34-35. E-mail: auction@cpo.by** | |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ЗАО «ГОРИЗОНТ-БЕЛИНВЕСТ-ДЕВЕЛОПЕР», 220029, г. Минск, ул. Красная, д. 7, ком. 4. УНП 191438026 |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Лот № 1 – Торговое помещение** (инв. № 500/D-798190607, общ. пл. 77,4 кв. м, сост. части и принад.: подсобное помещение магазина № 12 площадью 22,6 кв. м, административное помещение магазина № 14 площадью 12,5 кв. м, гардероб персонала магазина № 15 площадью 18,8 кв. м). Адрес: **г. Минск, ул. Стадионная, 9-256** | |
| **Начальная цена лота № 1, с НДС 20 % – 348 000,00 бел. руб.** | |
| **Лот № 2 – Торговое помещение** (инв. № 500/D-798190608, общ. пл. 67,5 кв. м, сост. части и принад.: гардероб персонала магазина № 16 площадью 18,6 кв. м, подсобное помещение магазина № 17 площадью 19,3 кв. м, административное помещение магазина № 18 площадью 14,3 кв. м, подсобное помещение магазина № 19 площадью 25,4 кв. м). Адрес: **г. Минск, ул. Стадионная, 9-257** | |
| **Начальная цена лота № 2, с НДС 20 % – 380 400,00 бел. руб.** | |
| **Лот № 3 – Торговое помещение** (инв. № 500/D-798190610, общ. пл. 59,4 кв. м, сост. части и принад.: административное помещение магазина № 24 площадью 19,8 кв. м, подсобное помещение магазина № 25 площадью 22,1 кв. м, подсобное помещение магазина № 26 площадью 25,5 кв. м). Адрес: **г. Минск, ул. Стадионная, 9-259.** Обременение: договор аренды | |
| **Начальная цена лота № 3, с НДС 20 % – 336 000,00 бел. руб.** | |
| **Шаг аукциона** – 5 % от текущей цены. **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638 | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пяти) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов | |
| **Срок оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем (победитель либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты объекта, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** со дня завершения электронных торгов | |
| Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **4 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия | |
| Публикация предыдущего извещения о проведении электронных торгов в газете «Звязда» от 16.05.2025 г. | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 14.07.2025 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **12.07.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by | |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», ул. Немига, 40, пом. 46, офис 2, г. Минск, 220004. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Пинский автобусный парк», Брестская обл., г. Пинск, ул. Брестская, 111. УНП 200298320 |
| **Оператор ЭТП/ Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», ул. Немига 40, пом. 46, офис 1, г. Минск, 220004. **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов – Автобус Neoplan 116, № кузова WAG201162SSS23094, рег. знак AI 4320-1, год выпуска не определен (установлен кузов 1995 г. в.), по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Брестская, 111. Начальная цена с НДС 20 % – 30 600,00 руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 5 (пять)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **6 %** от цены продажи лотов в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 30.04.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 14.07.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 12.07.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 29-154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**

**ООО «Деловая оценка»** (Организатор аукциона) по поручению **Лоевского РайПО** (Продавец) извещает о проведении **15 июля 2025 года** открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

**Лот № 1**: капитальное строение с инв. № 340/С-290109 общей площадью 376,6 кв. м (назначение: здание неустановленного назначения; наименование: гараж), расположенное по адресу: Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Батова, 59Б/4. Капитальное строение с инв. № 340/С-369 общей площадью 240,6 кв. м (назначение: здание неустановленного назначения; наименование: гараж), расположенное по адресу: Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Батова, 59Б/5. Капитальное строение с инв. № 340/С-3720 общей площадью 113,0 кв. м (назначение: здание неустановленного назначения; наименование: гараж), расположенное по адресу: Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Батова, 59Б/6. Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 323055100001000005.

**Начальная цена** продажи без НДС **– 3 880,00** бел. руб. без НДС. **Задаток 1 %** – 38,80 бел. руб.

Условие продажи: имеется необходимость в последующем выделении земельного участка, необходимого для обслуживания и эксплуатации объектов недвижимости. После проведения торгов Продавец уполномочивает Покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельного участка, необходимого для обслуживания предмета торгов, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с Продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению (выделению) земельного участка и прав на него, государственной регистрации и удостоверению договора купли-продажи, перехода права собственности на предмет торгов возлагаются на Покупателя.

**Продавец: Лоевское районное потребительское общество**, Гомельская область, г. п. Лоев, ул. Батова, 59.

Конт. тел.: +375 44 717-81-55, +375 29 345-09-66.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление Организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 14.07.2025 г. в 17.00.** Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте: www.deloocenka.by.

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена Продавцу в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение Организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем, будет учтен в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62**

# «ЛЮДЗІ Ў ПАГОНАХ У НАШАЙ КРАІНЕ ЗАЎСЁДЫ КАРЫСТАЛІСЯ АЎТАРЫТЭТАМ І ПАВАГАЙ»

**Дні напярэдадні галоўнага дзяржаўнага свята па традыцыі багатыя на знакавыя і ўрачыстыя падзеі. Адна з іх прайшла ў Палацы Незалежнасці — тут ушаноўвалі выпускнікоў ваенных навучальных устаноў і афіцэраў, якім прысвоены генеральскія званні. Пагоны і ўзнагароды ўручыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, урачысты прыём напярэдадні галоўнага дзяржаўнага свята — знак асаблівай павагі да нашай арміі.**



Фота БелТА.



Нягледзячы на святочную атмасферу, размова была сур'ёзнай. «Хто б яшчэ нядаўна мог сказаць, што ў год святкавання 80-годдзя Вялікай Перамогі раптам выразна выявяцца відавочныя гістарычныя паралелі з тымі далёкімі, прапахлымі порахам саракавымі гадамі? — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — У заходніх СМІ ўзмацняецца істэрыя пра «пагрозу з Усходу», а найбольш адвязаныя еўрапейскія палітыкі нават выказваюцца аб магчымасці прымянення на кантыненце ядзернай зброі. Не мы, не расіяне, як яны нас папракалі. Яны пра гэта загаварылі».

Прэзідэнт звярнуў увагу на заяву кіраўніцтва Еўрасаюза, што на працягу найбліжэйшых чатырох гадоў яны маюць намер рэалізаваць праграму пераўзбраення Еўропы з бюджэтам каля 800 мільярдаў еўра. «Ці тое яшчэ будзе», — адзначыў ён. «Адначасова падпалілі Блізкі Усход. Ізраіль напаў на Іран. Зноў пачынае іскрыць паміж Індыяй і Пакістанам. Працягваецца напружанасць вакол Тайваня. А ў шэрагу краін Афрыкі так званыя «гарачыя кропкі» ўспрымаюцца ўжо амаль як натуральныя прыродныя з'явы, — працягнуў беларускі лідар. — Самае сумнае, што кожны дзень гінуць тысячы людзей: і ваенных, і мірных. Я не кажу ўжо пра забітых дзяцей. Мы таксама бачым, што «адукаваныя» еўрапейцы маюць намер і далей працягваць бессэнсоўную бойню ва Украіне. Як яны, ужо не маскіруючыся і не саромеючыся, заяўляюць: да апошняга ўкраінца».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, супраць нас ужо некалькі дзесяцігоддзяў вядзецца перманентная гібрыдная вайна, якая ў далейшым будзе толькі набіраць абароты. «У нас ёсць чым адказаць. За тры дзесяцігоддзі намі створана сучасная, баяздольная, добра ўзброеная армія. На любыя агрэсіўныя выпады гатовыя даць самы жорсткі адказ, — заявіў беларускі лідар. — Я абсалютна перакананы (гэта не толькі мой пункт гледжання), што ракеты, самалёты, нарэшце, беспілотнікі — гэта добра. Але лёс любога бою будуць вырашаць камандзіры і іх падначаленыя, салдаты».

Прэзідэнт падкрэсліў, што мы пастаянна вывучаем вопыт сучасных войнаў, аналізуем і выкарыстоўваем усё, што можа ўзмацніць нашу і расійскую абараназдольнасць. Ён удакладніў, што гаворка ідзе і аб тэхніцы, узбраеннях, і, што не менш важна, аб прафесіяналізме, згуртаванасці, маральнавалявых якасцях салдат і афіцэраў.

«З атрыманнем дыплома Ваеннай акадэміі гэта вучоба не заканчваецца. Ужо ў верасні многія з вас паўдзельнічаюць у значным мерапрыемстве аператыўнай падрыхтоўкі — сумесным стратэгічным вучэнні Узброеных Сіл Беларусі і Расіі «Захад-2025», — звярнуўся Прэзідэнт да афіцэраў. — Для ўсіх прысутных гэта будзе і новая прыступка ў павышэнні прафесійнага майстэрства, і тэст на адпаведнасць патрабаванням сучаснай вайны. Перакананы, і гэты экзамен вы вытрымаеце з гонарам».

Кіраўнік дзяржавы павіншаваў усіх з паспяховым заканчэннем вучобы, а палкоўнікаў — з прысваеннем генеральскіх званняў. «Абарона Радзімы — праца нялёгкая, але вельмі высакародная, а людзі ў пагонах у нашай краіне заўсёды карысталіся аўтарытэтам і павагай у нашага народа, — сказаў ён. — Я абсалютна ўпэўнены ў вас. Жадаю моцнага здароўя, міру, сямейнага дабрабыту і вялікіх поспехаў на новых пасадах. У добры шлях, паважаныя афіцэры!»

## Даслоўна

## «Мы не маем права даваць слабіну»

Як прызналіся самі афіцэры ў размове з журналістамі, для іх гэты дзень — асаблівы. Але не толькі тым, што ён стаў святочнай датай у біяграфіі, але і тым, што надаў яшчэ больш адказнасці іх і без таго адказнаму шляху. **Дзмітрыю КУЧУКУ, начальніку Мінскага суворaўскага ваеннага вучылішча,** прысвоена званне генерал-маёра. І ён упэўнены: сапраўды дрэнны той салдат, які не марыць стаць генералам.

«У нас выдатная моладзь. Так, яны крыху не такія, як мы былі ў свой час. Але, тым не менш, у іх ёсць свае каштоўнасці, і ў тых хлопцаў, якія прыходзяць у суворaўскае вучылішча, ужо ёсць разуменне, што такое Радзіма, армія, навошта яны сюды прыйшлі. Большасць з іх ужо маюць планы на будучыню. Нам застаецца толькі ўмацаваць іх любоў да Радзімы і накіраваць іх па жыцці, — дзеліцца досведам Дзмітрый Кучук. — Кожны афіцэр, атрымліваючы званне лейтэнанта, разумее, што яго галоўны абавязак — абарона сваёй краіны, сваёй сям'і. І нашы маладыя афіцэры разумеюць, што мы жывём у вельмі няпросты час. Таму кожны з іх разумее, што ён павінен выконваць свой абавязак і абараняць сваю Радзіму».

**Аляксандр ЛАЎРОНАЎ, начальнік штаба, першы намеснік камандуючага войскамі заходняга аператыўнага камандавання,** цяпер носіць на плячах пагоны генерал-маёра. «Адказнасць з кожным званнем узрастае ў разы. Сучасныя ўмовы дыктуюць нам новыя правілы, звязаныя найперш з тым, што баявая гатоўнасць — гэта тое, на што абапіраецца наша армія. І мы не маем ніякага права ў цяперашняй абстаноўцы даваць слабіну», — адзначыў генерал-маёр.

**Палкоўнік Валерый ЯНУШКЕВІЧ** — выпускнік факультэта генеральнага штаба Ваеннай акадэміі — прызнаўся, што вайсковая служба — гэта не прафесія, а прызванне. «Калі я яшчэ курсантам паступаў у Ваенную акадэмію, мы праходзілі псіхалагічны тэст, дзе вялікая колькасць пытанняў прысвечана таму, навошта мы абралі гэту прафесію. І я магу сказаць, што мы выбіраем яе па закліку сэрца. І тыя хлопцы (а цяпер і дзяўчаты), якія выбіраюць ваенную справу такім чынам, становяцца сапраўднымі абаронцамі Радзімы», — падкрэсліў ён.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# У ІНТАРЭСАХ ДВУХ НАРОДАЎ

## Ад АПК да медыцыны: Беларусь мае намер развіваць узаемадзеянне з Лівіяй

**Прэм'ер-міністр Беларусі Аляксандр ТУРЧЫН учора правёў сустрэчу з дэлегацыяй урада Усходняй Лівіі на чале са старшынёй урада нацыянальнай стабільнасці доктарам Асамам ХАМАДАМ.**


Фота БелТА.

— За кароткі перыяд (усяго толькі за чатыры месяцы) гэта чацвёртая беларуска-лівійская сустрэча, што з'яўляецца сведчаннем узаемнай цікавасці да развіцця ўсяго комплексу традыцыйна дружалюбных двухбаковых адносін паміж народамі Беларусі і Лівіі, — падкрэсліў Аляксандр Турчын.

Ён нагадаў, што ў кантэксце гэтых сустрэч Прэзідэнтам Беларусі была пастаўлена задача выйсці на канкрэтныя эканамічныя праекты ў інтарэсах двух народаў.

— Мы вызначыліся, што патэнцыяльна перспектыўнымі сферамі супрацоўніцтва з'яўляюцца сельская гаспадарка і харчовая бяспека, прамысловасць, ахова здароўя і фармацэўтыка, адукацыя і развіццё чалавечага капіталу, прадухіленне стыхійных бедстваў і ліквідацыя наступстваў надзвычайных сітуацый, — канкрэтызаваў Аляксандр Турчын.

Кіраўнік беларускага ўрада нагадаў, што наша дзяржава валодае значным экспартным патэнцыялам: яе геаграфія паставак ахоплівае больш за 100 краін свету.

— Наша краіна займае істотныя пазіцыі ў экспарце малочнай і мясной прадукцыі, — адзначыў ён і дадаў, што наменклатура першых паставак у Лівію гэтых тавараў ужо вызначаная. — Маецца на ўвазе дзіцячае харчаванне, камбікармы для жывёл і прэпараты для барацьбы з саранчой.

Акрамя гэтага, Аляксандр Турчын падкрэсліў, што Беларусь — высокатэхналагічная дзяржава, якая вырабляе шырокую лінейку трактароў для розных мэт, пасажырскі і грузавы транспарт, сельскагаспадарчую, дарожна-будаўнічую і камунальную тэхніку.

— Канчатковая прадукцыя адпавядае ўсім сучасным патрабаванням, мае значны тэрмін службы. І ў рамках паставак мы арганізуем суправаджэнне тэхнікі з забеспячэннем сэрвіснага абслугоўвання і навучання персаналу, — запэўніў ён.

Прэм'ер-міністр звярнуў увагу і на тое, што Беларусь таксама вядомая ўзроўнем сваёй медыцыны.

— У 2024 годзе медыцынская дапамога была здзейснена больш як 160 тысячам замежных грамадзян са 159 краін свету, у тым ліку па медыцынскія паслугі звярнуліся больш за 1 тысячу грамадзян Лівіі, — паведаміў ён.

Яшчэ адным прывабным кірункам супрацоўніцтва можа стаць навучанне лівійскіх студэнтаў у беларускіх ВНУ, у тым ліку медыцынскага профілю.

— Ведаючы ваш сістэмны падыход да рэалізацыі намечаных планаў, перакананы, што з вашага боку ўзаемавыгадныя прапановы будуць падтрыманы, — выказаў упэўненасць Аляксандр Турчын. — Буду рады пачуць вашы прапановы па нашых перспектыўных кірунках супрацоўніцтва.

У сваю чаргу Асама Хамад падзякаваў за гасціннасць і прыкладзеныя намаганні беларускага боку па ўмацаванні двухбаковых адносін. Ён нагадаў, што апошнім часам быў праведзены шэраг візітаў і сустрэч паміж профільнымі ведамствамі і спецыялістамі.

— Адным з дасягненняў стала падпісанне мемарандума. Гэты дакумент стаў своеасаблівай «дарожнай картай» для развіцця нашага супрацоўніцтва ў найбольш перспектыўных галінах на карысць нашых краін і для рэалізацыі пажаданняў нашых народаў, — падкрэсліў старшыня ўрада нацыянальнай стабільнасці Лівіі.

Ён паведаміў, што двухбаковыя дакументы таксама былі падпісаны ў сферах сельскай гаспадаркі, медыцыны, надзвычайных сітуацый і іншых кірунках супрацоўніцтва.

Лівійскі госць падкрэсліў, што нашы краіны звязвае доўгая гісторыя адносін і сумесныя інтарэсы.

— Мы верым у агульную будучыню і бачым у Беларусі перспектыўнага партнёра, — рэзюмаваў Асама Хамад.

АКЦЭНТЫ

# НАЦЭЛЕНАСЦЬ НА ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ

## Дзейнасць прадпрыемстваў прамысловасці — у цэнтры ўвагі

**Учора Прэм'ер-міністр Аляксандр ТУРЧЫН прадставіў калектыву Мінпрама новага кіраўніка — Андрэя Кузняцова, якога Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 30 чэрвеня прызначыў міністрам прамысловасці. Прэм'ер таксама абазначыў задачы новаму кіраўніку холдынга «Амкадор» Аляксандру Яфімаву, які ўзначальваў да нядаўняга часу профільнае міністэрства.**

— Самае галоўнае — нацэленасць на эфектыўнасць работы нашых прадпрыемстваў. Міністэрства прамысловасці як рэгулятар павінна займацца ўсімі кірункамі дзейнасці галіны і падведамных прадпрыемстваў (і аб'ёмам вытворчасці, і экспартам), — падкрэсліў Прэм'ер-міністр.

Што датычыцца падтрымкі ўрада, Аляксандр Турчын запэўніў новага кіраўніка галіны ў тым, што ён можа разлічваць на усёабдымную падтрымку пры выкананні пэўных умоў.

Былы ж міністр прамысловасці Аляксандр Яфімаў прызначаны кіраваць холдынгам «Амкадор».

— Адно з найважнейшых прадпрыемстваў у галіне машынабудавання ў нашай краіне, якое аказалася ў вельмі няпростай сітуацыі, — адзначыў Прэм'ер-міністр. — Хачу адразу падкрэсліць, што дзякуючы рашэнню Прэзідэнта, а ён перш за ўсё клапоціцца пра людзей, якія працуюць на прадпрыемстве, яно перайшло пад крыло дзяржавы.

Ён дадаў, што прадпрыемства перайшло з вялікай колькасцю абавязацельстваў, якія неабходна будзе выконваць разам з профільным міністэрствам.

— Вельмі няпростае рашэнне. Яшчэ раз хачу падкрэсліць, яно абумоўлена клопатам пра людзей, якія працуюць на «Амкадоры». Таму што, калі б не дапамога дзяржавы, не ўпэўнены, што прадпрыемства змагло б працягнуць работу з такім грузам назапашаных абавязацельстваў, — канкрэтызаваў Аляксандр Турчын.

Ён паставіў задачу новым кіраўнікам холдынга і профільнага міністэрства забяспечыць паспяховую работу «Амкадора».

— Каб сёння прадпрыемства паспяхова працавала, выпускала канкурэнтаздольную прадукцыю і забяспечвала людзей годным заробкам. Задача няпростая, — прызнаў кіраўнік урада і пажадаў Аляксандру Яфімаву поспехаў. — Думаю, для вас гэта ў пэўным сэнсе справа гонару.

У завяршэнне Прэм'ер-міністр адзначыў, што на дадзены момант урадам рыхтуецца нарматыўны прававы акт, які комплексна дапаможа вырашыць праблемы холдынга «Амкадор».

Гаворачы ў цэлым аб рабоце галіны, Прэм'ер-міністр таксама нацэліў кіраўнікоў на аптымізацыю затрат, зніжэнне расходаў, дыверсіфікацыю экспартных паставак.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Минский домостроительный комбинат», 220015, г. Минск, ул. Пономаренко, 43 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**

| № лота | Наименование, инв. № | Общ. пл., кв. м | № кв. | Начальная цена лота, руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Местоположение – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16** | | | | |
| 1 | **Квартира**, инв. № 500/D-7988236244 | 105,3 | 65 | 362 328,00 |
| 2 | **Квартира**, инв. № 500/D-7988236246 | 91,9 | 71 | 322 110,00 |
| 3 | **Квартира**, инв. № 500/D-7988236248 | 81,1 | 75 | 284 220,00 |
| 4 | **Квартира**, инв. № 500/D-7988236249 | 81,3 | 82 | 284 940,00 |
| 5 | **Квартира**, инв. № 500/D-7988236250 | 91,9 | 85 | 322 110,00 |
| 6 | **Квартира**, инв. № 500/D-7988236252 | 81,1 | 89 | 284 220,00 |
| 7 | **Квартира**, инв. № 500/D-7988236253 | 91,8 | 92 | 321 750,00 |

**Задаток 1 %** от начальной цены лота перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 3 (три) рабочих дня** с даты заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и установленное вознаграждение **4 %** от цены продажи лотов в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 18.06.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 14.07.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 12.07.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 317-95-42.
E-mail: auction@cpo.by**

СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

**«Выезжай на смартфоне. В летний драйв!»**

**Сведения об организаторе:**
Общество с ограниченной ответственностью «ПАЛОМА СЕРВИС», зарегистрированное 30.01.2015 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за номером 690017072, УНП 690017072, место нахождения: 220020, г. Минск, пр. Победителей, д. 100, пом. 2, электронный адрес: info@nasvyazi.by.

**Наименование рекламной игры:** «Выезжай на смартфоне. В летний драйв!»

**Срок начала и окончания рекламной игры:** с 18 апреля 2025 года по 31 июля 2025 года.

**Сведения о государственной регистрации рекламной игры:** свидетельство о регистрации № 4529 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 9 апреля 2025 г.

**Сведения о количестве участников рекламной игры:** 16 944.

**Сведения о полном или частичном розыгрыше призового фонда:** призовой фонд разыгран полностью.

**Фамилия, инициалы победителя (победителей), его выигрыш (их выигрыши):**

| № розыгрыша | Фамилия, инициалы | Выигрыш |
|---|---|---|
| 1 | Минина Н. Ф. | Денежные средства в размере 2 298,85 бел. руб. |
| 1 | Гируть А. Е. | Денежные средства в размере 2 298,85 бел. руб. |
| 1 | Драчева Л. Г. | Денежные средства в размере 2 298,85 бел. руб. |
| 1 | Гончарова И.С. | Денежные средства в размере 2 298,85 бел. руб. |
| 1 | Крук А. Э. | Денежные средства в размере 2 298,85 бел. руб. |
| 2 | Ярёменко Ю. В. | Денежные средства в размере 3 448,28 бел. руб. |
| 2 | Кочубеев М. И. | Денежные средства в размере 3 448,28 бел. руб. |
| 3 | Борецкий В. В. | Денежные средства в размере 5 747,13 бел. руб. |
| 4 | Теплов С. В. | Денежные средства в размере 11 494,25 бел. руб. |
| Главный выигрыш | Казакова И. А. | Автомобиль BYD E2 405km Luxury (2024) VIN LC0CE4DC6R0577029, стоимостью 50 493,33 бел. руб. Денежные средства в размере 7 544,98 бел. руб. |

**Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры:** +375 (29) 3030303.
Время работы: с 09:00 до 22:00 в рабочие дни

## Извещение о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды открытой площадки с покрытием

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | Открытое акционерное общество «Солигорскторг», г. Солигорск, ул. Л. Комсомола, 44 |
| Дата, время и место проведения аукциона | 15.07.2025, 11.00, актовый зал ОАО «Солигорскторг» |
| **Лот № 1** | |
| **Предмет аукциона** | **право заключения договора аренды открытой площадки с покрытием** |
| Общая площадь, кв. м | 10,0 |
| Местонахождение недвижимого имущества | Минская область, г. Солигорск, ул. К. Заслонова, 63, район магазина № 35 |
| **Целевое использование имущества** | **Организация деятельности в соответствии с законодательством Республики Беларусь, санитарными нормами и противопожарными требованиями, для размещения нестационарного торгового объекта по реализации плодоовощной продукции** |
| **Условия аукциона** | До подачи заявления на участие в аукционе необходимо согласовать с начальником отдела архитектуры и строительства райисполкома (Макей С. В.) и (или) с отделом торговли и услуг райисполкома (Томка Т. С.) внешний вид, цветовое решение и рекламное оформление объекта; обеспечить функционирование объекта в соответствии с указанным целевым использованием; обеспечить содержание объекта и прилегающей территории в соответствии с санитарными нормами и правилами; обеспечить наличие документов, подтверждающих безопасность эксплуатации объекта согласно установленным правилам (при необходимости); обеспечить подключение объекта к источнику электроэнергии (при необходимости); обеспечить подвод воды и канализации к объекту в соответствии с санитарными нормами и правилами (при необходимости); установить контейнер и заключить договор со специализированным предприятием на вывоз мусора (при необходимости); установить биотуалет (при необходимости); обеспечить сохранность зеленой зоны в случае расположения объекта в непосредственной близости к ней; по истечении срока договора аренды открытой площадки с покрытием произвести демонтаж объекта и восстановить благоустройство, нарушенное за время работы объекта |
| Начальная цена права заключения договора аренды объекта, руб. | 46,93 |
| Сумма задатка, руб. | 46,93 |
| Срок договора аренды | 3 года |
| Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы, устанавливаемый арендодателем | Ежегодно с 01.04 по 31.10 – 43 БАВ в месяц; с 01.11 по 31.03 – 2 БАВ в месяц |
| Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона в предусмотренных законодательством случаях, руб. | 4 200,00 |

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Солигорск, ул. Л. Комсомола, 44, финансовый отдел, с 8.00 до 16.00 по рабочим дням по 14 июля 2025 г. включительно, телефоны: 8 (0174) 26 07 31, 23 65 26.

Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by (https://au.nca.by), Солигорского районного исполнительного комитета – www.soligorsk.gov.by (Главная/Экономика и бизнес/Инвестору/Аукционы), открытого акционерного общества «Солигорскторг» – www.soligorsktorg.by (Главная/Аукционы)



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»** (Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **СОАО «Минский завод автомобильной комплектации»** (Продавец)

**Электронные торги состоятся 04.08.2025.**

**Лот № 1.** Станок токарный 16К20, инв. № 330, зав. № 03793. Начальная цена с НДС 20 % – 8 040,00 руб. Задаток – 804,00 руб.

**Лот № 2.** Станок фрезерный 6К82Ш, инв. № 01533, зав. № 613. Начальная цена с НДС 20 % – 13 800,00 руб. Задаток – 1 380,00 руб.

**Лот № 3.** Станок горизонтально-фрезерный 6Т83-1, инв. № 1455, зав. № 781. Начальная цена с НДС 20 % – 8 400,00 руб. Задаток – 840,00 руб.

**Лот № 4.** Станок токарный 1М63МФ101, инв. № 01484, зав. № 652. Начальная цена с НДС 20 % – 10 080,00 руб. Задаток – 1 008,00 руб.

**Местонахождение Лотов №№ 1–4:** г. Минск, ул. Лынькова, 123. **Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **31.07.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182


Складнікі нашай незалежнасці: захаванне памяці

# АДДРУКАВАНА Ў ЧЫРВОНЫМ І ЗОЛАЦЕ

### Нумар «Звязды» за 3 ліпеня 1945 года быў па-сапраўднаму святочным нават у афармленні

Пра гэты нумар у звяздоўскім асяроддзі хадзілі нават легенды. Кожнаму маладому пакаленню старэйшыя разам з аповедамі пра Уладзіміра Амельянюка, першыя падпольныя нумары, востраў Зыслаў (у нас багатая і гераічная гісторыя, ёсць пра што распавесці!) пераказваюць гісторыю і пра газету, выпушчаную да гадавіны вызвалення Беларусі ад фашыстаў — нумар за 3 ліпеня 1945 года. Гэта была самая першая поўнакаляровая газета, кажучы прафесійнай мовай, аддрукаваная ў фармаце 4+4. Сёння гэта не навіна, а тады нават у нармальных умовах гэта была падзея. Што ўжо казаць пра краіну, якая была літаральна растаптаная акупантамі...




Але нумар — шыкоўны нават па сённяшнім часе — выйшаў. З чырвона-пунсовым сцягам, з элементамі, пафарбаванымі ў залаты колер (менавіта пра іх была «звяздоўская» легенда: нібыта золата друкары і супрацоўнікі рэдакцыі наносілі ўручную на ўсе газеты вялізнага тыражу). За восемдзесят гадоў, што прайшлі з яго выпуску, шчыльная папера толькі крыху пажаўцела, а фарбы зусім не пацьмянелі, залатая нават блішчыць. Дарэчы, друкавалі газету ў два прыёмы, як сведчаць выхадныя даныя: *«Друкаванне нумару ў фарбах выканана рэспубліканскай літаграфіяй (г. Гродна). Тэкст надрукаваны ў друкарні імя Сталіна (г. Мінск)».*

Хтосьці з канапных крытыкаў зараз скажа: людзі яшчэ ўдосталь не маглі наесціся хлеба, жылі ў зямлянках, навошта такая раскоша? А каб паказаць людзям, што яны гэтай раскошы вартыя, што на гэтых яркіх старонках — пра іх, пра народ, які вытрымаў, выжыў і перамог; што самую страшную навалу з зямлі год назад прагналі, а значыць, будзе і хлеб, і новыя дамы, і кнігі, і газеты — калі трэба будзе, дык і з пазалочанымі літарамі.

А тая залатая лічба і ў тэксце «перадавіцы» абыграная: *«Трэцяга ліпеня! Залатымі літарамі запісаная гэта дата на старонкі гісторыі гераічнага беларускага народа. Прамяністым, яркім святлом вее ад яе, і невыказанай цеплынёй саграввае яна душу і сэрца, будзіць вялікую, нязменную радасць шчасця».*

У нумары шмат віншаванняў. Першае ў падборцы — ад Маршала Перамогі Георгія Жукава: *«Ад усяго сэрца вітаю цябе, гераічны народ Беларусі, у радасны дзень гадавіны твайго вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Шчыра жадаю табе найлепшых поспехаў у аднаўленні народнай гаспадаркі і культуры, працвітання і шчасця ў мірным будаўніцтве». «Радзіма мая дарагая! З глыбокім хваляваннем і радасцю ў сэрцы шлю гарачае прывітанне і віншаванні ў гадавіну вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў... Я рад, што дажыў да гэтых шчаслівых дзён маёй Радзімы»*, — пісаў у віншаванні народны мастак Вітольд Бялыніцкі-Біруля. А народны паэт Якуб Колас апублікаваў артыкул «Жыві, Беларусь!». *«Першая гадавіна вызвалення нашай сталіцы застае нас у самым разгары адбудавання краіны. Мы не пашкадуем сваіх сіл для вялікай работы, і ўсе цяжкасці мы пераможам. Парукаю таму — невычарпальныя сілы нашага народа, загартаванага ў шматвекавой барацьбе, праз кроў і пакуты пранёсшага сваю культуру, сваю мову»*, — пісаў класік.

Славуты савецкі публіцыст Ілья Эрэнбург у артыкуле «Верная сярод верных» напісаў вось такія словы: *«Яна была мірнай зямлёй, і, здаецца, нідзе не было такога спакою, такой цішыні, такой сардэчнай скромнасці, як у яе сёлах. Але калі прыйшоў на беларускую зямлю вораг, знайшліся для яго і самадзельныя гранаты, і ружжы, і агонь, і страсць. Верная сярод верных, будзь благаславёна, Беларусь. Народ, які можа так ваяваць, — вялікі народ. Беларусы залечаць раны роднай зямлі. Яны адбудуюць Мінск, Гомель, Магілёў, усе гарады, спаленыя ворагам. Яны перамаглі захопнікаў, яны перамаглі гора. З імі цені герояў. З імі памяць аб гадах выпрабаванняў. З імі слава партызанскіх подзвігаў. З імі любоў і гордасць Савецкай Радзімы...»*

У святочным нумары героі — тыя самыя беларусы, якія адбудоўваюць краіну. Трактарысты Цімкавіцкай МТС з-пад Капыля Васіль Лобан і Васіль Сакалоўскі, якія дааралі тысячны гектар і *«далі якраз чатыры гадавыя нормы»*. Начальнік цэха гомельскага завода Барыс Чарны, які эвакуіраваўся з прадпрыемствам на Урал, працаваў там для фронту, а цяпер вярнуўся з таварышамі *«падымаць з руін і папялішчаў родны завод»*...

Яны — тыя, пра якіх «Звязда» пісала восемдзесят гадоў таму ў нумары з залатым аздабленнем, да якіх з усіх эпітэтаў найчасцей ужываўся «гераічны», — не волаты з казкі. Гэта рэальныя людзі, нашы з вамі дзядулі, бабулі, нашы зусім не далёкія продкі. І нам трэба пра гэта ведаць, памятаць і быць вартымі. Бо незалежнасць, дзень якой мы будзем заўтра адзначаць, у многім трымаецца менавіта на веданні і памяці.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

# СВЕДЧАННІ САМААХВЯРНАСЦІ І ГЕРАІЗМУ

### Нумар «Звязды» 80-гадовай даўнасці, а таксама іншыя артэфакты партызанскага жыцця беражліва захоўваюцца ў сям'і Уладзіміра КОРШУКА і яго дачкі Алены

На ўнікальным (першым каляровым!) выпуску, прысвечаным гадавіне вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, простым алоўкам напісана — «Захавайце для мяне». Ад'язджаючы з бацькавай хаты ў 1953 годзе на вучобу ў Маскву, Уладзімір Канстанцінавіч зрабіў пазнаку, дзякуючы якой святочны нумар «Звязды» захоўваецца да гэтага часу. Ды яшчэ ў такім стане, што любы музей можа пазайздросціць. Дарэчы, у многіх з іх, па ўсёй краіне, экспануюцца падпольныя выданні з калекцыі сям'і Коршукаў. Некалькі экзэмпляраў, праўда, пакінулі сабе — як напамін аб вайне, якая забрала самае дарагое.

Гутарым з Уладзімірам і Аленай Коршукамі — бацькам і дачкой — пра гісторыю з'яўлення ў іх святочнага нумара «Звязды», падпольных выданняў і пра партызанскі лёс сям'і. Дарэчы, ваенная тэма не адпускала іх і пасля вызвалення: вядомы вучоны, доктар гістарычных навук Уладзімір Коршук прысвяціў ёй шмат навуковых прац.

## «ДАГЭТУЛЬ БАЛІЦЬ, ШТО НЕ РАЗВІТАЎСЯ З МАМАЙ»

Уладзімір Канстанцінавіч — сын партызана. Як тады называлі, сын палка. Нарадзіўся ў гарадскім пасёлку Урэчча, што на Любаншчыне, у сям'і дырэктара школы і дырыжора школьнага хору. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР Канстанціна Коршука прызначылі першым загадчыкам Брэсцкага абласнога аддзела народнай асветы. У Брэсце і сустрэлі вайну. Пакідалі горад пешшу — ішлі аж да Уздзенскага раёна, дзе ў вёсцы Мрочкі жылі бацькі галавы сям'і.

З самага першага дня на малой радзіме Канстанцін збіраў зброю і боепрыпасы, што пакідалі чырвонаармейцы пры адступленні, хаваў іх у лесе. Пасля звязаўся з партызанамі, праз нейкі час сышоў у партызанскі атрад, разам з ім пайшлі яшчэ 10 чалавек.

Затым здарылася страшнае. «Стараста-паліцай выдаў немцам чатырох жанчын-яўрэек, сярод іх была і мая бабуля, — расказвае Алена Коршук. — Бацька дагэтуль памятае, як яе забіралі. Калі прыйшлі немцы, ён спалохаўся — схаваўся пад ложак. Бабулю вывелі на вуліцу, казалі, што павязуць у гета. Яна клікала сына, хацела развітацца, а ён ад страху не мог вылезці. Думаю, дагэтуль яму баліць, што не развітаўся з мамай».

Чатырох жанчын, у тым ліку Ганну Давыдаўну, знайшлі на наступны дзень каля лесу. Нежывымі...

Заставацца ў бабулі з дзядулем маломy было небяспечна. З рызыкай для ўласных сем'яў аднасяльчане хавалі хлопца ад фашыстаў пад выглядам уласнага дзіцяці, чым, вядома, зберaглі яму жыццё. Падвяргаць гэтых добрых людзей небяспецы, як і ўсю сваю вялікую сям'ю, было нельга. Адной з начэй бацька забраў малога ў партызанскі атрад. Хлопцу было ўсяго восем гадоў.

«Дзядуля даведаўся, што з вострава Зыслаў на Вялікую зямлю лятаюць самалёты: забіраюць параненых і дзяцей, — расказвае Алена Коршук. — Спадзяваўся, што так і ён выратуе адзінага сына. Аднак быў перыяд, калі самалёты не прызямляліся, толькі скідвалі партызанам цюкі з неабходным для барацьбы...»

## ЗАМЕСТ ЗБРОІ — СЛОВА

Спачатку ў партызанскім атрадзе Канстанцін Коршук быў звычайным байцом. Удзельнічаў у баях, выступаў перад насельніцтвам, запісваў атрыманыя па радыё зводкі Саўінфармбюро. У цэласнасці і захаванасці ляжаць гэтыя сшыткі з каштоўнымі па тым часе паведамленнямі.

У лютым 1943 года Канстанціна Фёдаравіча прызначылі намеснікам рэдактара міжраённай партызанскай газеты «Патриот Родины». У ліпені 1943-га зацверджаны кіраўніком друкарні і карэктарам партызанскай газеты «Калгаснік Капыльшчыны». У тыле ворага былі выпушчаны 63 нумары тыражом у 34 тысячы экзэмпляраў. У падпольнай друкарні таксама выпускаліся лістоўкі, звароты да насельніцтва і партызан. Восенню таго ж года Уладзіміра Коршука прызначылі інструктарам Мінскага падпольнага абкама партыі.

Недарэмна востраў Зыслаў называлі «вострaвам друку» — акрамя многіх міжраённых перыядычных выданняў, тут выходзілі маладзёжная газета «Чырвоная змена» і рэспубліканская «Звязда». З журналістам-звяздоўцам, Георгіем Шчарбатавым, у Канстанціна Коршука завязалася сяброўства.

Вось што ў сваёй кнізе «Партызанскія агні», выдадзенай пасля вайны, пісаў Георгій Шчарбатаў: «Цікава пабываць у партызанскіх буданах. Тут можна назіраць за незвычайнай дзейнасцю некаторых партызан. Вось у невялічкім будане над сталом, усланым рознымі паперамі, схіліўся сярэдніх гадоў чалавек. Гэта былы настаўнік Канстанцін Фёдаравіч Коршук, які ўжо тры гады партызаніў у тутэйшых лясах...».

У ліпені 1944 года Канстанціну Коршуку даручылі адказную місію — арганізоўваць навучальны працэс на толькі што вызваленай тэрыторыі Беларусі. Старанна выверaныя спісы настаўнікаў Міншчыны, якія засталіся ў жывых, з інфармацыяй аб іх дзейнасці ў гады вайны — яшчэ адзін экспанат сямейнага архіва. Дзякуючы гэтаму спісу 1 верасня 1944-га на Міншчыне адчынілі свае дзверы першыя пасляваенныя школы.

Мінскім абласным аддзелам народнай асветы Канстанцін Коршук кіраваў да красавіка 1969 года. Неаднаразова выбіраўся дэпутатам Мінскага абласнога Савета. Прайшоўшы шлях ад настаўніка пачатковай школы да кіраўніка раённай асветы ў Беларусі, заслужаны настаўнік СССР зрабіў важкі ўнёсак у станаўленне і развіццё адукацыйнай галіны ў Беларусі. Красамоўна аб гэтым сведчаць шматлікія ўзнагароды: ордэны Леніна і Чырвонага Сцяга, два ордэны Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэн «Знак Пашаны», медалі.


Уладзімір КОРШУК трымае ў руках выпуск «Звязды» за 3 ліпеня 1945 года.

## САМЫ ДАРАГІ ПАДАРУНАК У СВЕЦЕ

Годным працягам гэтага выдатнага чалавека, партызана, стаў яго сын. У 1944 годзе яго ўдалося пераправіць на Вялікую зямлю. Некаторы час Валодзя знаходзіўся ў гомельскім спецыяльным дзіцячым доме № 1 для дзяцей ваеннаслужачых і партызан. Пасля вызвалення Беларусі па яго прыехаў бацькаў таварыш. У Мінску ён адвёў хлопца ў дом на набярэжнай Свіслачы, дзе той і чакаў самага роднага чалавека.

«Раптам бачу — бацька мой ідзе! — успамінае сын партызана. — У гімнасцёрцы, з медалём. Сям'я, дзе я некалькі гадзін правёў, запрасіла нас на вячэру. За сталом гаспадыня спытала, колькі мне гадоў. Я сказаў, што дзевяць. А бацька і кажа: «Не, сынок, сёння табе ўжо дзесяць». Вось такі я атрымаў падарунак на дзесяцігоддзе! Самы дарагі падарунак у свеце — майго бацьку». Больш яны ніколі не расставаліся. Другая бацькава жонка, Ганна Іванаўна Канцавая (дарэчы, у свой час першы намеснік міністра асветы), замяніла яму маці.

Уся прафесійная дзейнасць Уладзіміра Коршука была звязана з гістарычнай навукай. Адразу пасля заканчэння гістфака Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава гісторыю выкладаў школьнікам, затым, на працягу 60 гадоў, — студэнтам. Працяглы час доктар гістарычных навук, прафесар загадваў кафедрай гісторыі КПСС БДУ, а пасля яе рэарганізацыі — кафедрай палітычнай гісторыі, затым — сусветнай і айчыннай гісторыі. З 2001 да 2020 года з'яўляўся прафесарам кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу гістфака БДУ. Прафесар Коршук падрыхтаваў вялікую плеяду навукоўцаў: пад яго кіраўніцтвам былі абаронены больш за 30 кандыдацкіх і адна доктарская дысертацыі. У жніўні заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь адзначыць 90-гадовы юбілей.

Па бацькавым шляху пайшла і дачка. Алена Коршук — кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры міжнароднай журналістыкі факультэта журналістыкі БДУ. Менавіта яна захавальніца сапраўднага скарбу — сведчанняў партызанскага жыцця, актыўнымі ўдзельнікамі якога былі яе родныя людзі. Сярод гэтых каштоўных рэчаў — і выпуск «Звязды» за 3 ліпеня 1945 года.

«Дык як у сям'і з'явіўся гэты нумар?» — пытаюся напрыканцы нашай сустрэчы.

Адказ просты: «Выпісвалі».

**Вераніка КАНЮТА, фота аўтара**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

Унитарное предприятие **«Могилевское отделение БелТПП»** **5 августа 2025 г. в 14.00** проводит торги по продаже следующих объектов

| № п/п | Наименование объекта продажи | Начальная цена продажи с учетом НДС 20 %, белорусских рублей | Задаток, белорусских рублей |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Автомобиль GEELY ATLAS (легковой автомобиль, хэтчбек), 2021 г. выпуска, идентификационный номер (VIN) Y4K8742Z7MB309012 в аварийном состоянии | 10830,00 (десять тысяч восемьсот тридцать белорусских рублей 00 копеек), в том числе НДС 20 % в сумме 1805,00 белорусских рублей | 1083,00 (одна тысяча восемьдесят три рубля 40 копеек) |

**Собственник имущества:** ОАО «Лента», 212003, г. Могилев, ул. Челюскинцев, 65, Республика Беларусь, УНП 700002794, тел. для осмотра объектов продажи +375297411415.

**Организатор торгов:** Унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1.

**Место проведения торгов:** г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Лот № 1 продается без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору торгов, в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Задаток перечисляется на расчетный счет унитарного предприятия «Могилевское отделение БелТПП» р/с № BY88ALFA30122641790010270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Могилев, BIC: ALFABY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

Условия регистрации, участия в торгах, фото объекта продажи размещены на интернет-сайте организатора по адресу: www.mogilev.cci.by.

**Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем)** – в течение 10 рабочих дней после проведения торгов.

Срок оплаты предметов торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

Торги состоятся 05 августа 2025 г. в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112. Последний срок подачи заявления – 04 августа 2025 г. до 12.00.

Регистрация участников торгов 05 августа 2025 г. с 13.30 до 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Телефоны для справок: (0222) 778032, +375 44 735 00 30 – Жилина Ольга Александровна



**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**

**Лот № 1: капитальное строение с инвентарным номером 111/С-7270** (наименование: **Фельдшерско-акушерский пункт;** назначение: Здание специализированное здравоохранения и (или) предоставления социальных услуг) площадью 60,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ляховичский р-н, Жеребковичский с/с, д. Шевели, ул. Центральная, 28, на земельном участке с кадастровым номером 125086206601000020, площадью 0,0570 га, составные части и принадлежности: одна дощатая с облицовкой кирпичом веранда, крыльцо, один шиферный сарай, одна дощатая уборная и металлическое ограждение

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 3 268,70 | Размер задатка, руб. | 326,87 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Жеребковичи», 225390, Брестская обл., Ляховичский р-н, аг. Жеребковичи, тел. 80163345223. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./ф 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/сч для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенного договора купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 18 июля 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** а также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-41**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 17 июля 2025 г. до 17.00**

Брестский филиал
РУП «Институт недвижимости и оценки»
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**Лот № 1**

1) Капитальное строение с инвентарным номером 120/С-14123 (наименование: Промышленный склад; назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) площадью 914,6 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Березовский р-н, г. Белоозерск, ул. Шоссейная, д. 13, на земельном участке с кадастровым номером 120851000002000083 площадью 1,3316 га, составные части и принадлежности: две террасы.
2) Капитальное строение с инвентарным номером 120/С-14121 (наименование: Пристройка склада; назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 114,1 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Березовский р-н, г. Белоозерск, ул. Шоссейная, д. 13, на земельном участке с кадастровым номером 120851000002000083 площадью 1,3316 га.
3) Капитальное строение с инвентарным номером 120/С-14117 (наименование: Промышленный и продовольственный склад; назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) площадью 1867,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Берёзовский р-н, г. Белоозёрск, ул. Шоссейная, 13, на земельном участке с кадастровым номером 120851000002000083 площадью 1,3316 га, составные части и принадлежности: терраса, пандус.
4) Капитальное строение с инвентарным номером 120/С-14120 (наименование: Проходная склада; назначение: Здание специализированное иного назначения) площадью 8,6 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Березовский р-н, г. Белоозерск, ул. Шоссейная, д. 13, на земельном участке с кадастровым номером 120851000002000083 площадью 1,3316 га.
5) Капитальное строение с инвентарным номером 120/С-14125 (наименование: Столярная мастерская; назначение: Здание специализированное иного назначения) площадью 53,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Березовский р-н, г. Белоозерск, ул. Шоссейная, д. 13, на земельном участке с кадастровым номером 120851000002000083 площадью 1,3316 га.
6) Капитальное строение с инвентарным номером 120/С-14122 (наименование: Тарный склад; назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 344,4 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Березовский р-н, г. Белоозерск, ул. Шоссейная, д. 13, на земельном участке с кадастровым номером 120851000002000083 площадью 1,3316 га.
7) Капитальное строение с инвентарным номером 120/С-14124 (наименование: Гараж; назначение: Здание специализированное автомобильного транспорта), площадью 386,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Березовский р-н, г. Белоозерск, ул. Шоссейная, д. 13, на земельном участке с кадастровым номером 120851000002000083 площадью 1,3316 га, составные части и принадлежности: сарай

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 552 100,00 | Размер задатка, руб. | 55 210,00 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Брестская областная база «Бакалея», 224020, г. Брест, ул. Янки Купалы, 100, тел. 80162356470. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. Срок заключения договора купли-продажи: в течение 10 календарных дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 05 августа 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** а также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-41**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329, в рабочие дни с 09.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 04 августа 2025 г. до 17.00**



ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ
ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321, тел. 8 017 516 80 64) по поручению **Государственного учреждения «Вилейский территориальный центр социального обслуживания населения»** (222410, Минская обл., г. Вилейка, ул. Водопьянова, 33), проводит открытый аукцион

**по продаже автомобиля легкового специального седана CHEVROLET AVEO,**

**2007 год выпуска, кузов (VIN) № KL1SF697J8B030310, цвет оранжевый, инвентарный номер 01510007, находящегося по адресу: Минская область, г. Вилейка, ул. Водопьянова, 33.**

**Начальная цена** (без НДС) – **4 400,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **440,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 20 %.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by. Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by. Предыдущая информация опубликована в газете «Звязда» от 10.05.2025.

Электронные торги состоятся **18.07.2025** в **10.00.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.07.2025** до **17.00.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра транспорта (8 01771) 3 63 58, время осмотра с 09.00 до 16.00, понедельник – пятница.**

УНН 600690567




## Складнікі нашай незалежнасці:

ПРАЦОЎНЫЯ ДЫНАСТЫІ

# «СВАЮ РАБОТУ ТРЭБА

### 325 гадоў — менавіта столькі налічвае агульны стаж сям'і

Адкрытае акцыянернае таварыства «БЕЛАЗ» — кіруючая кампанія холдынга «БЕЛАЗ-ХОЛДЫНГ» — гэта прадпрыемства, якое працуе стабільна на працягу 77 гадоў, а прадукцыя завода пастаўляецца не толькі ў Беларусь, але і ў многія іншыя краіны свету. На сёння ААТ «БЕЛАЗ» займаецца вытворчасцю кар'ерных самазвалаў вялікай і асабліва вялікай грузападымальнасці, спецыяльнай і спецыялізаванай тэхнікі для горназдабыўной, будаўнічай, металургічнай і іншых галін прамысловасці. Тут таксама распрацоўваюцца і выпускаюцца машыны для падземных работ, бульдозеры, пагрузчыкі і аэрадромныя цягачы. Гонар завода — кар'ерныя самазвалы, уключаючы самы вялікі ў свеце самазвал грузападымальнасцю 450 тон.
За высокімі вытворчымі паказчыкамі прадпрыемства стаіць самаадданая праца людзей, многія з якіх з'яўляюцца ганаровымі прадаўжальнікамі сямейных працоўных дынастый.
Сярод іх — дынастыя Міхейчыкаў, агульны працоўны стаж якой складае 325 гадоў.




## БЫЛО Ў БАЦЬКІ ПЯЦЬ СЫНОЎ...

...У шасцідзясятых гадах мінулага стагоддзя, скончыўшы курсы кіроўцаў у Смалявічах, уладкаваўся працаваць кіроўцам на аўтамабіль «БЕЛАЗ» Анатоль Міхейчык. Любоў да прафесіі Анатоль Пятровіч перадаў пяцярым сынам, якія па прыкладзе бацькі таксама набылі спецыяльнасць кіроўцы і прыйшлі працаваць на прадпрыемства. Старэйшы Анатоль атрымаў правы на вучэбна-вытворчым камбінаце ў Смалявічах. Пачаў свой працоўны шлях у жодзінскім аўтапарку. Пасля арміі некаторы час працаваў у саўгасе імя Урыцкага, а ў 1984 годзе стаў кіроўцам на Беларускім аўтамабільным заводзе. Анатоль Анатольевіч і цяпер успамінае, як дастаўляў рухавікі да аўтамабіля «БЕЛАЗ» з-за мяжы, з Англіі і Галандыі.

> **Атрымаўшы ўсе катэгорыі кіроўцаў, ён аддаў працы на заводзе 40 гадоў і з'яўляецца ветэранам завода.**

Яго брат Сяргей Анатольевіч скончыў Жодзінскае прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 149 і ў 1983 годзе ўладкаваўся ў аўтаматны цэх завода «БЕЛАЗ» слесарам па рамонце абсталявання. Пасля арміі зноў вярнуўся на завод. У транспартным цэху маладому кіроўцу быў давераны «ЗІЛ-130». У 1989-м Сяргей Анатольевіч стаў кіроўцам аўтамабіля «МАЗ», што дастаўляў запчасткі для транспартнага цэха. У 2009 годзе вопытны работнік перасеў на «МАЗ 5440 А9» з паўпрычэпам, на якім транспартуе прадукцыю завода і дастаўляе камплектуючыя да машын «БЕЛАЗа» з усёй тэрыторыі СНД.




Жодзінскае прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 149 скончыў і сярэдні брат Віктар. Набыўшы спецыяльнасць слесара-рамонтніка, Віктар Анатольевіч прыйшоў працаваць на «БЕЛАЗ» у 1988 годзе. Адслужыўшы ў арміі, зноў вярнуўся на завод, дзе працаваў слесарам-рамонтнікам. Праз тры гады, калі пасля развалу Савецкага Саюза эканамічнае становішча было нестабільным, мужчына прадоўжыў свой працоўны шлях у ведамаснай ваенізаванай ахове «БЕЛАЗа» стралком-кіроўцам. Разам з калегамі яму даводзілася затрымліваць зладзеяў, якія ўчынялі крадзяжы на вытворчасці.

Атрымаўшы дзве вышэйшыя адукацыі: завочна скончыўшы Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізкультуры і Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію, у 2009 годзе Віктар Анатольевіч атрымаў прапанову працаваць начальнікам майстэрняў транспартнага цэха. Адказнасць, ініцыятыва і вопыт Віктара Анатольевіча былі ацэнены на высокім узроўні. Для сваіх калег ён стаў мудрым дарадчыкам, а для маладых спецыялістаў — настаўнікам.

У 2016-м Віктару Анатольевічу прапанавалі ўзначаліць транспартны цэх. Затым некаторы час працаваў інжынерам у аддзеле галоўнага механіка, а ў 2022-м — зноў начальнікам транспартнага цэха, шчыраваў начальнікам аўтакалоны. Сёння Віктар Анатольевіч працуе намеснікам начальніка па адміністрацыйна-гаспадарчай дзейнасці аздараўленчага цэнтра «Дудзінка» пры ААТ «БЕЛАЗ». Належны ўзровень адукацыі, багаты працоўны вопыт і ўменне знаходзіць падыход да людзей вельмі патрэбныя Віктару Анатольевічу на гэтай пасадзе.

Чацвёрты сын Анатоля Пятровіча Пётр прыйшоў працаваць на завод у 1994 годзе пасля арміі. Пётр Анатольевіч — кіроўца ў транспартным цэху прадпрыемства ўжо больш за трыццаць гадоў. Спачатку сядзеў за рулём «БЕЛАЗ-Люблін», затым — «МАЗа», а цяпер ездзіць на «МАЗ-5440 А9» з паўпрычэпам.



## стваральная праца

# ЛЮБІЦЬ УСІМ СЭРЦАМ»

### Міхейчыкаў са славутага «БЕЛАЗа»

**Малодшы з братоў Аляксандр, набыўшы спецыяльнасць трактарыста-машыніста шырокага профілю ў Смалявіцкім прафесійна-тэхнічным вучылішчы № 204, па прыкладзе старэйшых братоў прыйшоў працаваць на «БЕЛАЗ». Аляксандр Анатольевіч працуе кіроўцам у транспартным цэху на той жа мадэлі «МАЗа», з паўпрычэпам, што і старэйшыя браты.**



## ДЗЕЦІ ПАЧЫНАЛІ З РАБОЧЫХ ПРАФЕСІЙ

ААТ «БЕЛАЗ» стала родным прадпрыемствам не толькі для братоў Міхейчыкаў, але і для іх жонак і дзяцей. Практычна ўсе яны, набыўшы адукацыю, пачалі свой працоўны шлях на заводзе, дзе шмат гадоў рупіліся бацькі.

Сын Анатоля Кірыл скончыў БДУІР па спецыяльнасці «Маркетолаг-праграміст» і цяпер працуе ў аналітычным аддзеле маркетынг-цэнтра. Менавіта тут збіраецца ўся інфармацыя аб адгрузцы прадукцыі прадпрыемства: што адгружаецца, якая сітуацыя на рынку, куды прадаецца прадукцыі больш, куды — менш і г. д. На аснове атрыманых звестак робіцца справаздача для кіраўніка.

**Нягледзячы на малады ўзрост, Кірыл Анатольевіч ужо мае працоўны вопыт. Пачаў свой шлях на заводзе слесарам механазборачных работ, затым быў інжынерам-праграмістам у прэсавым цэху, дзе распрацоўваліся малярныя робаты, быў заняты і на лазерным абсталяванні.**

Пяць гадоў таму малады чалавек паспяхова прайшоў адбор на пасаду, якую займае цяпер. Вялікае значэнне мае і тое, што Кірыл з'яўляецца прадаўжальнікам працоўнай сямейнай дынастыі.

Дачка Сяргея Анатольевіча Кацярына, якая набыла спецыяльнасць трэнера-выкладчыка па баскетболе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце фізічнай культуры, ні хвіліны не раздумваючы, прыйшла працаваць на сямейны завод. Была камплектоўшчыкам-кладаўшчыком у цэху запасных частак, дзе вядзецца адгрузка прадукцыі завода. Пасля паспяхова прайшла сумоўе на пасаду сакратара бухгалтара прадпрыемства. Праз два гады, адправіўшыся ў дэкрэтны водпуск, дзяўчына завочна набыла другую вышэйшую адукацыю. Скончыла Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт па спецыяльнасці «Бізнес-адміністраванне» і прадоўжыла працоўны шлях у бухгалтэрыі на пасадзе аператара — выпісвала таварныя накладныя. І ўжо праз год Кацярына стала бухгалтарам завода «БЕЛАЗ». У зоне ўвагі спецыяліста знаходзіцца работа складоў. Безумоўна, гэта работа патрабуе не толькі высокай кампетэнцыі, але і асаблівай пільнасці і ўвагі. Са сваімі абавязкамі Кацярына паспяхова спраўляецца. Бухгалтарам завода працуе і старэйшая сястра Кацярыны Анастасія. Жанчына скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі. Некаторы час працавала на заводзе кантралёрам і цяпер адказвае за вялікі ўчастак работы.

Па натуры энергічная і актыўная, Кацярына Сяргееўна не развітваецца са спортам, актыўна ўдзельнічае ва ўсіх мерапрыемствах, якія ладзяцца на заводзе.

Сын Віктара Анатольевіча Аляксей скончыў Жодзінскі політэхнічны каледж па спецыяльнасці «Электраманцёр па рамонце абсталявання» і працуе ў рамонтна-механічным цэху завода. У цяперашні час хлопец праходзіць тэрміновую службу ў войску Міністэрства ўнутраных спраў у 2-й брыгадзе спецыяльнага прызначэння.

**— Прызнаюся шчыра: за шматлікія гады работа для ўсіх нас стала неад'емнай часткай жыцця, — кажа Віктар Міхейчык. — Мы выбіралі свае прафесіі па душы і невыпадкова аддалі рабоце на заводзе шмат гадоў.**

***

Калі з'яўляецца вольная хвілінка, вялікая і дружная сям'я Міхейчыкаў збіраецца разам. Неаднойчы сям'я выступала ў конкурсе працоўных дынастый, які праводзіўся Міністэрствам прамысловасці Рэспублікі Беларусь. У 2022 годзе, напрыклад, яны занялі ганаровае трэцяе месца.

У летні час бацькі разам з дзецьмі з задавальненнем працуюць і на лецішчы, даглядаюць градкі.

— І для мяне, і для маіх братоў сэнс жыцця заключаецца ў шчырай і бездакорнай працы, — адзначае Віктар Анатольевіч. — З малых гадоў бацькі навучылі нас быць працавітымі, выконваць сваю справу так, каб за яе не было сорамна. Сваю работу трэба любіць усім сэрцам.

З захапленнем слухаю свайго суразмоўцу і чарговы раз пераконваюся ў тым, што надзейную будучыню прадпрыемстваў складаюць вось такія — адданыя сваёй справе — спецыялісты. Менавіта дзякуючы ім мы штогод даведваемся пра высокія працоўныя паказчыкі і ўпэўнена ствараем светлую будучыню краіны.

**Святлана СІЛЬВАНОВІЧ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА і з архіва герояў.**


## РУП «Торговый дом «Восточный»

**извещает о проведении 22.07.2025 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества**

**Лот № 1.**

Объект недвижимого имущества в составе:

1) Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-42706 общей площадью 1497,5 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Радошковичский с/с, 28, вблизи д. Удранка. Назначение: здание специализированное иного назначения; наименование: клуб-столовая. Составные части и принадлежности: блочный подвал, бетонное овощехранилище, асфальтобетонное покрытие, цементно-бетонные дорожки, ограждение.

2) Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-78086 общей площадью 42,2 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Радошковичский с/с, 28/10, вблизи д. Удранка. Назначение: здание специализированное иного назначения; наименование: трансформаторная подстанция. Составные части и принадлежности: отсутствуют.

3) Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-42710 общей площадью 225,5 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Радошковичский с/с, 28/3, вблизи д. Удранка. Назначение: здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей; наименование: спальный корпус. Составные части и принадлежности: четыре террасы на деревянных сваях.

4) Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-42708 общей площадью 225,8 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Радошковичский с/с, 28/2, вблизи д. Удранка. Назначение: здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей; наименование: спальный корпус. Составные части и принадлежности: четыре террасы на деревянных сваях.

5) Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-42709 общей площадью 224,9 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Радошковичский с/с, 28/5, вблизи д. Удранка. Назначение: здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей; наименование: спальный корпус. Составные части и принадлежности: четыре террасы на деревянных сваях.

6) Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-78084 общей площадью 107,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Радошковичский с/с, 28/8, вблизи д. Удранка. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: склад. Составные части и принадлежности: отсутствуют.

7) Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-78085 общей площадью 105,6 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Радошковичский с/с, 28/9, вблизи д. Удранка. Назначение: здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей; наименование: медицинский корпус. Составные части и принадлежности: две кирпичные пристройки.

8) Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-78090 общей площадью 15,8 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Радошковичский с/с, вблизи д. Удранка. Назначение: здание специализированное иного назначения; наименование: здание сторожки. Составные части и принадлежности: отсутствуют.

9) Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-78089, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Радошковичский с/с, 28/2, вблизи д. Удранка. Назначение: сооружение специализированное водохозяйственного назначения; наименование: водонапорная башня. Составные части и принадлежности: отсутствуют.

Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 623875700099000001 площадью 6,5437 га (право постоянного пользования). Обременения, связанные с Объектом, земельным участком, на котором он располагается: отсутствуют.

**Начальная цена продажи – 631 915,20 бел. руб. (с учетом НДС), задаток – 63 191,52 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %**

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов (далее – Претендент на покупку), не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает Организатору затраты на организацию.
2. Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона не может превышать 15 (пятнадцать) рабочих дней со дня проведения аукциона.
3. Срок оплаты предмета аукциона должен составлять не более 3 (трех) рабочих дней со дня подписания договора купли-продажи.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
5. Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте: konfiskat.by.

**Аукцион состоится 22.07.2025 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал**

Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка **с отметкой банка**, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 14а, в рабочие дни: пн.– чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15.

**Окончание приема заявлений – 17.07.2025 в 15.00.**

Задаток перечисляется на расчетный банковский счет Организатора аукциона: р/с BY53 AKBB 3012 0134 7111 1530 0000, БИК AKBBBY2X, ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ № 514, г. Минск, ул. Сурганова, 47а, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633, ОКПО 37411910. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), **Лот № 1,** проводимом **22 июля 2025 года.**

Сведения о Заказчике аукциона: ОАО «Алеся», УНП 100619249, ОКПО 05543030. 220123, г. Минск, ул. Старовиленская, 131, тел.: +375 17 270 39 10, +375 17 270 15 13.

Лот может быть снят с аукциона Организатором в любое время, но не позднее чем за 5 (пять) календарных дней до наступления даты проведения аукциона

**Контакты организатора аукциона:**
**+375 44 763 62 63; +375 275 75 12**

МЕРКАВАННІ

# «САМАЕ КАШТОЎНАЕ, ШТО МОЖА БЫЦЬ У НАРОДА І ДЗЯРЖАВЫ»

## Спыталі ў прадстаўнікоў розных узроўняў заканадаўчай улады, што для іх Дзень Незалежнасці



**Таццяна ІГНАЦЮК, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:**

— 3 ліпеня — дата, навекі ўпісаная ў летапіс нашай Радзімы залатымі літарамі. Гэта дзень вызвалення Мінска, дзень, які стаў сімвалам адраджэння беларускай дзяржаўнасці з попелу самай страшнай вайны ў гісторыі чалавецтва. Сёлета свята набывае асаблівую, глыбока сімвалічную важнасць — мы адзначаем 80-годдзе Вялікай Перамогі. Гэтыя дзве святыя даты непарыўна звязаны адной лёсавызначальнай ніткай.

Наша незалежнасць, наша свабода, наша мірнае неба — гэта прамы вынік той бяспрыкладнай Перамогі, здабытай неверагодней цаной. Калі мы глядзім на яркае неба на ўзыходзе сонца над роднымі прасторамі, успамінаем тых, чыя кроў акрапіла гэтую зямлю. Калі чуем радасны смех дзяцей, кланяемся памяці юных герояў, якія так і не сталі дарослымі. Калі праходзім міма манументаў і абеліскаў, адчуваем вечны абавязак перад пакаленнем пераможцаў — салдатамі, партызанамі, падпольшчыкамі, працаўнікамі тылу, усімі, хто абараніў наша права на жыццё і суверэнітэт.

Сёлета, у юбілейны год Перамогі, Дзень Незалежнасці гучыць як урачысты гімн пераемнасці пакаленняў і нацыянальнай стойкасці. Мы — нашчадкі вялікага подзвігу. Наш абавязак — не проста памятаць, але і берагчы заваяванае імі. Берагчы нашу незалежнасць як зрэнку вока. Берагчы мір і стабільнасць на нашай зямлі. Берагчы праўду пра вайну, перадаючы яе з вуснаў у вусны, ад сэрца да сэрца, каб ніякія вятры часу не змаглі сказіць святую памяць пра подзвіг народа.

Дзень Незалежнасці — гэта не толькі дзень памяці, але і дзень гонару за сённяшнюю Беларусь. Гонару за наш працавіты народ, які будуе моцную, суверэнную дзяржаву. За нашы дасягненні, за мір у нашых гарадах і вёсках, за тое, што мы захавалі і прымножылі тое, што было завешчана нам героямі 1945 года. Мы будуем будучыню, трывала стоячы на падмурку, закладзеным Перамогай.



**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў:**

— Незалежнасць — гэта самае каштоўнае, што можа быць у любога народа і дзяржавы. Для нас, беларусаў, важныя не нейкія папяровыя дэкларацыі, а рэальныя справы нашых продкаў, таму далёка не выпадкова менавіта 3 ліпеня — дзень вызвалення сталіцы Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — з'яўляецца Днём Незалежнасці. Тады, у гады Вялікай Айчыннай вайны, нашы продкі са зброяй у руках адстаялі права жыць на гэтай зямлі і жыць так, як мы лічым патрэбным. А гэта і ёсць рэальны суверэнітэт. Таму перамога ў Вялікай Айчыннай вайне мае вялікае значэнне для беларускага народа, беларускай дзяржаўнасці. Без гэтай перамогі не было б ні беларусаў, ні, натуральна, нашай дзяржавы. Свята 3 ліпеня фактычна з'яўляецца галоўным святам нашай краіны.

Галоўнай задачай палітыкі, якая праводзіцца ў нашай дзяржаве, з'яўляецца супрацьстаянне скажэнням і фальсіфікацыям гістарычнага мінулага. Беларусі ёсць што супрацьпаставіць. Вельмі важна як мага шырэй транслiраваць нашу гістарычную памяць, даносіць наш погляд перш за ўсё да маладога пакалення, таму што моладзь — будучыня нашай дзяржавы і на міжнароднай арэне трэба адстойваць свой погляд, сваю пазіцыю. Мы нічога не скажаем, не фальсіфікуем, мы ацэньваем гістарычнае мінулае з пазіцыі, што было дрэннага і што добрага для нашага народа. Той народ, які не ведае свайго гістарычнага мінулага або бачыць яго скажоным і фальсіфікаваным, не мае будучыні.



**Ганна ХВЯДЗЮК, старшыня Шчучынскага раённага Савета дэпутатаў:**

— Трэцяга ліпеня для маёй сям'і — галоўнае свята. Тыя, хто змагаўся за свабоду і незалежнасць у гады Вялікай Айчыннай вайны, вызваляў краіну ад нямецкага зла, — асаблівыя людзі, героі. Многія з іх цаной жыцця здабылі нашу свабоду. Мае маленькія ўнукі заўжды разам са сваімі бацькамі ідуць на свята з горда паднятай галавой, ускладаюць кветкі, таму што яны з маленства ведаюць, што мір у нашай краіне — здабытак пакаленняў. Людзі, якія жывуць на гэтай зямлі, сваёй працай, адносінамі да жыцця паднялі яе з попелу. Гэтым трэба ганарыцца. Мае стрыечныя дзядулі, якія змагаліся на франтах падчас Вялікай Айчыннай вайны, вельмі мала расказвалі. Калі я асабіста звярталася да іх з просьбай: «Раскажыце», у іх заўжды нагортваліся на вочы слёзы. Яны гаварылі: «Не дай Бог, каб ты ведала тыя пакуты і жахі, якія перажылі мы». Я стараюся перадаваць гэта сваім дзецям і ўнукам. Калі так будуць рабіць у кожнай сям'і, спадзяюся, мы захаваем мір на зямлі.

**Яна ВАЛАСАЧ.**

ПА СУТНАСЦІ

# БЕЛАРУСЬ НАЗАЎЖДЫ



Працавітая Беларусь рыхтуецца да свята — дзяржаўныя сцягі пад промнямі Незалежнасці. Гэта была адвечная песня нацыянальнай ідэі — маўляў, загляне сонца і ў наша аконца. Заглянула. Над Беларуссю бясхмарнае неба. Ва ўсіх сэнсах. Але каб хмары суровай геапалітычнай рэчаіснасці не засланілі яго, а цень драпежнага чужаземца зноў не выбівала прыкладам шыбу таго акна, нам варта застацца самімі сабой. Быць вернымі наратывам і ідэалам, трываламу падмурку нашай Незалежнасці. Моц нашай нацыянальнай мадэлі ў тым, што менавіта найлепшыя якасці грамадства фармалізаваны ў дзяржаўным ладзе.

Дзень Незалежнасці адлюстраваў усе эпохі беларускай дзяржаўнасці. Войнаў было шмат, апошняя магла сцерці з гісторыі наш народ. Таму і дата галоўнага дзяржаўнага свята выбрана свядома і па-беларуску мудра. Мы вывучылі страшны, крывавы ўрок Вялікай Айчыннай вайны. Таму і на ўсеагульным рэферэндуме разам прынялі ўдзячнае рашэнне — Дзень Незалежнасці будзе 3 ліпеня.

Не кожная краіна здолела вытрымаць малох акупацыі. Нават самыя старажытныя дзяржавы пакрываліся пылам забыцця. Бяда згуртавала тады, застанёмся разам і ў радасці цяпер. 3 ліпеня — гісторыя нашай краіны. Гэта гісторыя кожнай нашай сям'і. Наказ просты і мудры: не забывайце сваіх продкаў.

Павага да мінулага і ёсць ментальны код нацыі. І невыпадкова так склалася, што плеяда нашых свят дзяржаўнага і народнага календароў гарманічна пераплялася як узоры на вышыванцы. Дзень Незалежнасці і Купалле — свята прыроды, але з хрысціянскімі каштоўнасцямі — шанавання зямлі і роду. А яшчэ побач дзень памяці нашага Песняра Янкі Купалы. Ён сказаў, што мы дзеці тройчы ў адным крузе: роднае матулі, маці-Беларусі і матухны-зямлі. Таму тая павага да бацькоўскай хаты, дзедавай сцяжынкі, да зямлі — гэта ж тая самая нацыянальная ідэя. Быць гаспадаром на сваёй Радзіме — насамрэч спрадвечная мара беларусаў. Вось так і здарылася. Працай і потам здабываем сваё багацце. Іншага шляху няма. Інакш трапім у дрыгву.

Беларусаў ведаюць, паважаюць і любяць. У кантэксце сусветнай гісторыі мы ўжо занялі сваё пачэснае месца. Таму што змаглі абараніць яго. І ўсё дзякуючы нашай родавай памяці. Да манументаў і абеліскаў беларусы ідуць сем'ямі. Загінуў кожны трэці, памяць аб продках у кожнай сям'і, у тысячах абеліскаў. Яны паўсюль: ад сталіцы да далёкага ўзлеску. Гэта наша рана, але і наш гонар. Павагай да гісторыі, продкаў прасякнуты ўвесь ментальны код.

Сваімі васільковавымі вачыма Беларусь міралюбіва глядзіць на ўсіх сваіх сяброў і партнёраў міжнароднай сям'і. Са свайго фарватару наша краіна ніколі не збочвала. У капітанскай рубцы загадзя абдумалі, куды рухацца, каб не сесці на мель, не патрапіць у палітычную бездань. Сваёй міралюбівасцю мы гатовыя шчодра дзяліцца з усім светам. Але ў арсенале нават самай паспяховай і прызнанай дыпламатыі павінны быць (і ёсць) выцвярэжвальныя аргументы.

Мінск прамаўляе на ўвесь свет. І гэты голас мае моц таму, што беларусы не гандлююць сваёй памяццю. Каштоўнасці і традыцыі нашай дзяржаўнасці настолькі зразумелыя і блізкія, што радзімай Беларусь стала і для многіх іншаземцаў. Усе адчулі плюсы жыцця пад крыламі з суверэнным размахам.

На сусветнай авансцэне больш не гучыць рытарычнае пытанне: «А хто там ідзе?» Гучыць упэўненае — «Мы — беларусы». Гэта і ёсць Незалежнасць. За адвечную мару спаўна заплачана па рахунках. Велічны сведка — Курган Славы. У назве — код дзяржаўнасці. Курган Славы — увасабленне нацыянальных сэнсаў. І мы ідзём, уздымаемся да яго вяршыні. Каб Беларусь была назаўжды.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**


УНП 193734126

**ООО «СидНеА» организует конкурсные торги**

| Дата и время проведения | Предмет (право на заключение договоров купли-продажи/аренды) | Начальная цена: сумма в белорусских рублях, эквивалентная долларам США по курсу НБ РБ на день проведения торгов | Общая площадь | Конкурсное обеспечение в бел. руб. | Срок заключения договора купли-продажи/аренды |
|---|---|---|---|---|---|
| **31.07.2025 10.00** | Продажа жилого дома, с кад. ном. 623685704601000087, с инв. № 600/С-81347, по адресу: Минская обл., Минский р-н, Петришковский с/с, д. Кривое Село, ул. Центральная, д. 23 | 49000 | 49.7 кв. м. | 2500 | 90 |
| **31.07.2025 12.00** | Продажа комплекса зданий бывшего озд. лагеря по адресу: Минская обл., Воложинский р-н, Раковский с/с, д. Выгоничи: 1) Двухэтажное кирпичное здание спального корпуса с инв. № 632/С-17386, с кад. № 622085700001000303; 2) Двухэтажное кирпичное здание спального корпуса с инв. № 632/С-17385, с кад. № 622085700001000302; 3) Одноэтажное кирпичное здание столовой с инв. № 632/С-17390, с кад. № 622085700001000304; 4) Волейбольная площадка с инв. № 632/С-26619, с кад. № 622085700001000305; 5) Баскетбольная площадка с инв. № 632/С-26620, с кад. № 622085700001000306; 6) Одноэтажное кирпичное здание павильона встреч с родителями с инв. № 632/С-17387, с кад. № 622085700001000308; 7) Танцевально-костровая площадка с инв. № 632/С-26618, с кад. № 622085700001000309 | 420000 | 1) 1845,6 кв. м; 2) 718,3 кв. м; 3) 925,8 кв. м; 4) 353,0 кв. м; 5) 518,0 кв. м; 6) 160,8 кв. м; 7) 601,0 кв. м | 2500 | 90 |

**Изменение цены по объекту, опубликованному в газете «Звязда» № 108 (30496) от 06.06.2025, с изменением цены в газете «Звязда» № 122 (30510) от 26.06.2025**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **07.07.2025 10.00** | Продажа дачного дома, с кад. ном. 622281300006000462, по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, Демидовичский с/с, СТ «АЛЕСЯ» 204 | 93000 | 97,1 | 2500 | 90 |

**Изменение цены по объекту, опубликованному в газете «Звязда» № 116 (30504) от 18.06.2025**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **17.07.2025 11.30** | Продажа жилого дома с инв. № 620/С-47593, с кад. ном. 622285510101000127, по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, Фанипольский с/с, д. Первомай, ул. Луговая, д. 19 | 134000 | 89,2 кв. м. | 2500 | 90 |

**Изменение цены по объекту, опубликованному в газете «Звязда» № 112 (30500) от 12.06.2025**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **11.07.2025 12.00** | Продажа дачного дома, с кад. ном. 623883000007000066, с инв. № 630/С-53711, по адресу: Минская обл., Молодеченский р-н, Олехновичский с/с, СТ «Восход-92», д. 59 | 24900 | 76 кв. м. | 2500 | 90 |

**Отмена конкурсных торгов по объекту**

| | |
|---|---|
| Отмена конкурсных торгов по объекту, назначенных на 07.07.2025 в 10.00; опубликованных в газете «Звязда» № 122(30510) от 26.06.2025 | Продажа квартиры с инв. № 600/D-51637, по адресу: Минская обл., Минский р-н, Папернянский с/с, д. Цнянка, ул. Армейская, д. 3, кв. 27 |

Торги состоятся по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 1Б, каб. 7, 7 этаж.
Срок внесения конкурсного обеспечения и приема заявлений с прилагаемыми к нему документами прекращаются за один рабочий день до проведения торгов по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 1Б, каб. 7, 7 этаж.
Конкурсное обеспечение вноситься на р/с BY14MTBK30120001093300123688 в ЗАО «МТБанк», БИК (код) MTBKBY22.
Победитель торгов в день проведения подписывает протокол о результатах торгов.
Иные условия проведения объявленных конкурсов: право подачи и подписания заявления о государственной регистрации договора купли-продажи и основанных на нем прав предоставляется покупателю.
Лицо, выигравшее торги, определяется в соответствии с правилами проведения конкурсов по продаже (аренде) имущества ООО «СидНеА», утвержденным приказом директора от 05.03.2024 № 9-ОД.
Организатор вправе отказаться от конкурсов (повторного конкурса) в любое время до начала торгов.
Телефон для справок (+37529) 171-50-50



## Складнікі нашай незалежнасці: бяспека

# «ГАРПУН» АДПЛАТЫ

**Камітэт дзяржаўнай бяспекі правёў шматходовую спецаперацыю і сарваў планы атакі ўдарных дронаў на Беларусь. Пра гэта расказалі ў эфіры тэлеканала АНТ.**

Спецаперацыя доўжылася 732 дні. Яе сутнасць — выцягнуць з-за мяжы арганізатара групы, якая рыхтавала ўдарныя дроны, каб з паветра ўзарваць беларускія стратэгічныя аб'екты. Збеглыя планавалі ўдарыць дронамі па Беларусі. У прыватнасці, па БелАЭС у Астраўцы.

Дзякуючы аперацыі з-за мяжы ўдалося выцягнуць арганізатара групы. Гэта Павел Бялюцін. Ён нарадзіўся ў Мінску ў 1977 годзе, займаўся прадпрымальніцтвам, захапляўся спортам. Паступова пачаў прытрымлівацца радыкальных поглядаў. У 2016 годзе далучыўся да руху «Салідарнасць», які ўзначальваў Мікалай Аўтуховіч — фігурант некалькіх крымінальных спраў. Пасля выбараў 2020 года была затрымана групоўка з 12 чалавек са зброяй і трацілам. Павел Бялюцін праходзіў па той крымінальнай справе. Пасля затрымання Аўтуховіча Бялюцін уцёк за мяжу.

**У 2020 годзе ён удзельнічаў у незаконных акцыях і пісаў у інтэрнэце пагрозы і абразы на адрас прадстаўнікоў улады і сілавых структур. За гэтыя дзеянні супраць яго распачалі крымінальныя справы.**



Фота БелТА.

Павел Бялюцін уцёк у Літву, дзе адразу ж далучыўся да віленскай харугвы, клуба «Літвіны». Падобныя ствараліся для нападзення на Беларусь. Усе харугвы ў Літве і Польшчы аб'яднаны «Паспалітым рушэннем» — цэнтрам, які каардынуе дзеянні, трымае сувязь з баевікамі, забяспечвае трэніроўкі, каб ваяваць. Асаблівы ўпор — на вывучэнне баявых дронаў і іх кіраванне. Для гэтага зрабілі нават асобны чат «Людзі на балоце», куды ўвайшоў і Бялюцін. У ім сабраліся тыя, хто вызначыўся агрэсіўным экстрэмізмам у 2020 годзе, а потым уцёк за мяжу. Жаданне адпомсціць «беларускаму рэжыму» было настолькі вялікае, што ў адным з чатаў яны пачалі не толькі абмяркоўваць ударныя дроны, але і самі іх рыхтаваць.

**Бялюціна ўзялі пад шчыльнае назіранне супрацоўнікі КДБ, якія дакладна пралічвалі кожны яго крок для нейтралізацыі пагрозы. І для гэтага была прыдумана спецаперацыя «Гарпун». Назва — не выпадковая. Такім метадам вырашылі ўчапіць аб'ект, а потым выцягнуць яго ў Беларусь, ізаляваць, каб не дапусціць бяды.**

Пастку зрабілі на базе сайта КДБ Беларусі ў раздзеле «Электронныя звароты грамадзян і юрыдычных асоб». Там знаходзіўся архіў. Унутры — тысячы паведамленняў. Яго скарэкціравалі і ўнеслі зварот ад імя Паўла Бялюціна: «Добры дзень. У мяне ёсць некаторыя падставы меркаваць, што грамадзянін Рэспублікі Беларусь Аўтуховіч Мікалай Мікалаевіч прадумвае і пачынае ажыццяўляць падрыхтоўку да спробы ўзброенага захопу ўлады ў нашай краіне. Пра спробу даведаўся са слоў грамадзяніна Аўтуховіча». Паведамленне дадалі ў архіў і замаскавалі пад рэальнае з базы даных.

Супрацоўнікі КДБ кантралявалі ўвесь працэс, як зламыснікі спрабавалі ламаць вэб-рэсурс. У канчатковым выніку яны атрымалі доступ да блока, які быў спецыяльна пакінуты для іх.

Усё ішло згодна з планам КДБ. Злачынцы спампавалі базу даных — і менавіта тую, якую ім спецыяльна падсунулі. А праз пяць дзён у апазіцыйным асяроддзі скандал — збеглыя знайшлі тое самае паведамленне Бялюціна, яго самога абвясцілі стукачом.

Бялюціна выклікалі на допыт у ДДБ Літвы. І далей дыскрэдытацыя «змагара» ажыццяўлялася ўжо аўтаматычна. 29 ліпеня 2024 г. Дэпартамент міграцыі пры МУС Літвы прызнае яго пагрозай нацбяспецы. 29 кастрычніка таго ж года Бялюціна пазбаўляюць статусу бежанца. 16 студзеня 2025 года суд у Каўнасе прымае рашэнне аб забароне знаходжання ў Літве. Бялюцін разумее, што ў прыбалтыйскай рэспубліцы яго могуць пасадзіць ці дэпартаваць у Беларусь. Ён стукаецца ў чатыз збеглых у Германіі. Далей шукае дапамогі ў збеглых у Партугаліі, дзе яго таксама не прымаюць. Бялюцін робіць спробу дастукацца і да збеглых у Іспаніі, але дарэмна.

**Бялюцін мыкаўся па розных краінах Еўропы, разумеў, што нікому не патрэбны. Выматаны абыякавасцю, кінуты сваімі ж. Дэталі яго прыбыцця ў Мінск пакінулі за кадрам. Але Бялюцін у Беларусі, дзе яму давядзецца адказваць па законе.**

Аперацыя «Гарпун» скончана. Але адплата чакае ўсіх. «Камітэт дзяржаўнай бяспекі неаднаразова заяўляў, што асобы, якія ўчынілі злачынствы, асабліва цяжкія злачынствы супраць дзяржавы, дзе б яны ні знаходзіліся, будуць жыць з думкай аб тым, што немінуча надыдзе гадзіна адплаты», — падкрэсліў **начальнік следчага ўпраўлення КДБ Канстанцін БЫЧАК**, звяртаючыся да збеглых.

**Паводле БелТА.**

# «КАБ СВЯТЫ ПРАЙШЛІ БЯСПЕЧНА»

## Сталічная міліцыя пераходзіць на ўзмоцнены рэжым нясення службы

**Падчас працяглых выхадных, якія сёлета пройдуць з 3 да 6 ліпеня, падраздзяленнямі сталічнай міліцыі будуць прыняты дадатковыя меры па забеспячэнні бяспекі.**

Пра гэта заявіў **начальнік упраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі ГУУС Мінгарвыканкама Сяргей ГАРОХАЎ.** Асаблівую ўвагу, паводле яго слоў, аддадуць прафілактыцы бытавых злачынстваў, узмацненню кантролю за асобамі, якія знаходзяцца на розных уліках, а таксама месцам масавага адпачынку і месцам масавага знаходжання грамадзян.

«Асноўныя святочныя мерапрыемствы пройдуць 3 ліпеня ў цэнтральнай частцы горада. З 11:00 пачнецца пропуск на святочны кірмаш каля Палаца спорту, — паведаміў Сяргей Гарохаў. — Там будзе арганізавана чатыры кантрольна-прапускныя пункты. У гэты ж дзень з 12:00 да 13:00 на плошчы Перамогі пройдзць цырымонія ўскладання кветак да знакавага манумента. Перад Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі на асноўнай пляцоўцы з 21:00 да 23:00 пройдзе канцэртная праграма і акцыя «Спяваем гімн разам!». Пропуск грамадзян будзе ажыццяўляцца з 19:00 праз кантрольна-прапускныя пункты».

Акрамя таго, супрацоўнікі сталічнай міліцыі будуць сачыць за бяспекай на 16 раённых пляцоўках, дзе таксама пройдуць святочныя мерапрыемствы. «Традыцыйна мы раім грамадзянам планаваць наведванне мерапрыемстваў не на асабістым транспарце, а з выкарыстаннем грамадскага, найбольш зручным пунктам высадкі часцей за ўсё з'яўляецца станцыя метро «Няміга». А каб у раёне дома № 2 па праспекце Пераможцаў не атрымалася вялікіх чэргаў, намі будуць ажыццёўлены і арганізаваны кантрольна-прапускныя пункты ў пяці месцах. Гэта праспект Пераможцаў у раёне вуліцы Гвардзейская і дома № 2, праспект Машэрава ў раёне паркоўкі каля парку Перамогі, у раёне вуліцы Заслаўскай і па вуліцы Мельнікайтэ», — адзначыў Сяргей Гарохаў.

Пропуск грамадзян у раёне стэлы будзе ажыццяўляцца праз 15 кантрольна-прапускных пунктаў. «Перад кожным мы размесцім інфармацыйныя стэнды з указаннем рэчываў і прадметаў, забароненых для праносу. Прадугледжаны таксама асобныя пункты пропуску для ветэранаў, інвалідаў, цяжарных жанчын, бацькоў з малалетнімі дзецьмі».

Акрамя таго, у месцах размяшчэння ўсіх КПП будуць устаноўлены камеры захоўвання. У 18:30 усе кантрольна-прапускныя пункты будуць гатовыя да запуску грамадзян. Далей у 23:00 у шасці пунктах горада пройдуць святочныя феерверкі. Гэта пляцоўка каля «Чыжоўка-Арэны», парк Паўлава, пляцоўка каля Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, парк Перамогі і набярэжная вадасховішча «Дразды». Усе яны будуць ачэпленыя супрацоўнікамі міліцыі ўжо з 19:00.

«Пры выяўленні безгаспадарных рэчаў, выбуховых прылад, незразумелых прадметаў неабходна адысці на бяспечную адлегласць, паведаміць пра гэта найбліжэйшаму нараду міліцыі альбо па тэлефоне «102». На ўсіх лакацыях будуць працаваць супрацоўнікі міліцыі, гатовыя аказаць дапамогу, а таксама медыцынскія службы. У цэлым сталічная міліцыя гатовая да правядзення святочных мерапрыемстваў і нацэлена на ўважлівае стаўленне да грамадзян. Мы заўсёды адкрытыя для зносін, для пытанняў, таму зробім усё неабходнае, каб святочныя мерапрыемствы прайшлі спакойна і бяспечна», — падкрэсліў Сяргей Гарохаў.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**


## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Лот № 1:**

1) капитальное строение с инвентарным номером 111/С-6555 (наименование: навес для с/х машин; назначение: здание нежилое), площадью 873,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ляховичский р-н, Жеребковичский с/с, 18/1, вблизи д. Зубелевичи, на земельном участке с кадастровым номером 125081100001001428, площадью 0,9511 га;
2) капитальное строение с инвентарным номером 111/С-6554 (наименование: склад запчастей; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 2556,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ляховичский р-н, Жеребковичский с/с, 18/10, вблизи д. Зубелевичи, на земельном участке с кадастровым номером 125081100001001428, площадью 0,9511 га

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 95 900,00 | Размер задатка, руб. | 9 590,00 |
|---|---|---|---|

**Лот № 2:**

1) капитальное строение с инвентарным номером 111/С-10224 (наименование: сенохранилище; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 373,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ляховичский р-н, Жеребковичский с/с, 14В, 0,6 км южнее г. Ляховичи, на земельном участке с кадастровым номером 125081100001001426, площадью 0,7314 га;
2) капитальное строение с инвентарным номером 111/С-12850 (наименование: овощехранилище; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 32,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ляховичский р-н, Жеребковичский с/с, 14Б, вблизи д. Потаповичи, на земельном участке с кадастровым номером 125081100001001426, площадью 0,7314 га;
3) капитальное строение с инвентарным номером 111/С-10223 (наименование: коровник; назначение: здание специализированное животноводства), площадью 1782,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ляховичский р-н, Жеребковичский с/с, 14А, 0,6 км южнее г. Ляховичи, на земельном участке с кадастровым номером 125081100001001426, площадью 0,7314 га, составные части и принадлежности: один железобетонный и два из металлической сети забора, одни ворота из металлической сетки и асфальтобетонная подъездная дорога;
4) капитальное строение с инвентарным номером 111/С-10229 (наименование: артскважина; назначение: сооружение специализированное водохозяйственного назначения), расположенное по адресу: Брестская обл., Ляховичский р-н, Жеребковичский с/с, 13, вблизи д. Потаповичи, на земельном участке с кадастровым номером 125081100001001427, площадью 0,2951 га, составные части и принадлежности: артскважина, насосная;
5) капитальное строение с инвентарным номером 111/С-14514 (наименование: водонапорная башня; назначение: сооружение специализированное водохозяйственного назначения), площадью 1,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ляховичский р-н, Жеребковичский с/с, 14Д, вблизи д. Потаповичи, на земельном участке с кадастровым номером 125081100001001425, площадью 0,0686 га, составные части и принадлежности: А-Водонапорная башня

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 376 600,00 | Размер задатка, руб. | 37 660,00 |
|---|---|---|---|

**Организатор электронных торгов, оператор электронной торговой площадки:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701, gostorg.by.
**Продавец:** ОАО «Нача», 225391, Брестская обл., Ляховичский р-н, аг. Нача, ул. Советская, 16, тел./факс 80163352505.
Задаток вносится на расчетный счет Организатора электронных торгов до подачи заявления. Реквизиты для перечисления задатка: р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901, назначение платежа: задаток за участие в электронных торгах по продаже объекта ОАО «Нача».
**Условия продажи:**
- по Лоту № 1: участник электронных торгов, выигравший торги, в сроки, указанные в договоре купли-продажи, обязан возместить Продавцу средства, затраченные на проведение работ в размере: 4 004,22 рубля;
- по Лоту № 2: участник электронных торгов, выигравший торги, в сроки, указанные в договоре купли-продажи, обязан возместить Продавцу средства, затраченные на проведение работ в размере: 9 417,34 рубля.
**Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения электронных торгов.
**Условия оплаты:** согласно заключенного договора купли-продажи.
**Информация о возмещении затрат:** участник электронных торгов, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня электронных торгов возмещает вознаграждение Организатора торгов и фактические затраты на организацию и проведение электронных торгов.
**Срок возможного отказа от проведения электронных торгов:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения электронных торгов.
**Шаг торгов:** 5 %

**Электронные торги состоятся 06 августа 2025 г. в 11.00**

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG».
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-41

**Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 04.08.2025 до 16.00**

ПАМЯЦЬ

# АДКУЛЬ БЯРЭ ПАЧАТАК НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ

## У Прэзідэнцкай бібліятэцы праходзяць выстаўкі з унікальнымі архіўнымі дакументамі і кнігамі

Да Дня Незалежнасці Прэзідэнцкай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь некалькі каштоўных падарункаў зрабілі краіны, з якімі склаліся сяброўскія адносіны. Убачыць рарытэты, а таксама наведаць выстаўкі, прысвечаныя галоўнаму святу беларускай дзяржаўнасці, можа любы ахвотны.

Расія прэзентавала два новыя праекты, якія ўражваюць не толькі цудоўным афармленнем, але і ўнікальным зместам.

**Адзін з іх — «Карты Вялікай Перамогі», дзе сабраны арыгінальныя баявыя карты часоў Вялікай Айчыннай вайны. Гэта матэрыялы, з якімі працавалі афіцэры, плануючы аперацыі. Па картах можна прасачыць, як крок за крокам рухаліся войскі, якія рашэнні прымаліся і як мянялася лінія фронту.**

Сярод матэрыялаў — асабістыя подпісы камандавання, уключаючы Вярхоўнага Галоўнакамандуючага. Гэта не проста гістарычныя дакументы, а рабочыя інструменты таго часу. Трэба сказаць, што картографы ў гады вайны выконвалі сваю работу ў найскладанейшых умовах: на перадавой, пад абстрэламі, і іх праца дазваляла войскам арыентавацца і дзейнічаць дакладна.

Яшчэ адзін падарунак з Расіі — адукацыйны праект РІА «Новости» для школьнікаў і студэнтаў.

— Ён імкнецца гаварыць з моладдзю на яе мове — праз візуальныя матэрыялы, QR-коды і інтэрактыўныя фарматы, — расказвае **намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці Прэзідэнцкай бібліятэкі Ала ПЕНДА**. — Гэта вельмі прадуманы і сучасны падыход да гістарычнай асветы, разлічаны на розныя ўзроставыя групы. Падобныя ініцыятывы дапамагаюць школьнікам і студэнтам не проста запомніць факты, а асэнсаваць іх, далучаючыся да працэсу праз відэа, аўдыя і тэсты.

**У найбліжэйшай перспектыве Прэзідэнцкую бібліятэку папоўніць трэцяя частка праекта РІА «Новости», прысвечаная вызваленню Беларусі. Сярод асаблівасцяў — плакаты з унікальнымі фатаграфіямі і кароткімі фактамі, многія з якіх публікуюцца ўпершыню. QR-коды вядуць да дадатковых матэрыялаў: можна прачытаць артыкул, паслухаць аўдыяфрагмент ці прайсці тэст.**

А вось нядаўнім падарункам урадавай кніжніцы ад Азербайджана сталі кнігі, якія апісваюць гісторыю, культуру ці славутасці краіны і яе сталіцы — Баку.

Гэтымі днямі праходзіць у бібліятэцы і некалькі выставак. Адна з іх расказвае пра гісторыю самой установы на прыкладзе газетных публікацый розных часоў (а яна, між іншым, была створана ў 1933 годзе). На іншай экспазіцыі можна пазнаёміцца з кнігамі, прысвечанымі вызваленню Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Выданні расказваюць, як у акупаваны Мінск увайшла танкавая брыгада пад кіраўніцтвам Аляксея Бурдзейнага і пачалося вызваленне горада. З гэтай выстаўкі






таксама можна даведацца, чаму многія франтавікі называлі Днепр ракой герояў. Менавіта 23 верасня 1943 года пры актыўным фарсіраванні Дняпра быў вызвалены пасёлак Камарын Гомельскай вобласці і якраз з гэтай даты бярэ пачатак вызваленне Беларусі.

**Безумоўна, кажучы пра вызваленне Радзімы, нельга не згадаць і наступальную стратэгічную аперацыю «Баграціён». Кнігі, прысвечаныя ёй, раскажуць шэраг цікавых фактаў. Напрыклад, пра велічны сяміметровы помнік, які знаходзіцца ў вёсцы Раковічы Гомельскай вобласці, адкуль і пачалася аперацыя.**

Памяць пра Вялікую Айчынную вайну жыве і ў іншых мемарыялах і кнігах пра іх. Гэта Брэсцкая крэпасць-герой, а таксама Буйніцкае поле, дзе ў бітве па абароне Магілёва ўдзельнічаў вядомы пісьменнік Канстанцін Сіманаў, які пасля апісаў яе ў рамане «Жывыя і мёртвыя». І, вядома, такі мемарыял, як Курган Славы, размешчаны на тым месцы, дзе ў 1944 годзе праходзіла адна з частак аперацыі «Баграціён» — Мінскі кацёл, падчас якой была разгромлена 105-тысячная нямецкая армія.

А нашу сталіцу нельга ўявіць без 38-метровага манумента Перамогі на адной найменнай плошчы. Адна з кніг расказвае цікавую гісторыю яго стварэння, які падзяліўся сам архітэктар Георгій Заборскі. Ён задумаў гэты помнік яшчэ ў 1942 годзе, калі з раненнем ляжаў у шпіталі. Архітэктар папрасіў у палату бальнічныя бінты, на якіх і зрабіў эскіз будучага манумента, ужо ў той час упэўнены ў перамозе савецкага народа.

**Алена КРАВЕЦ.**


**ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Профитсистем»**

| Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. (1 %) | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 2051 | Комплект оборудования для производства топливных гранул мощностью 900 тонн/месяц, согласно списку № 1: https://orgtorg.by/upload/doc/profitsistem/2051.pdf | Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. Загородная, 3Б | 536396,16 | 5363,96 | 26819,81 |
| 2083 | Скобозабивной пн/пистолет 92/40-712 – инв. 60000010; Вайма универсальная Б/У (турникетный пресс ТН 6 2500/850) 2010 г. вып., инв. 44505003; Установка компрессорная ВК15Е (40107); Кондуктор для сборки поддонов PS2000 (инв. 44505008); Линия сращивания бруса ЛБС-005-6000 (Б/У) инв. 44505002; Станок 4-сторонний Weinig (РП) – 44502012; Станок форматно-раскроечный MJ1132F (инв. 44501004); Стреппинг машина ТР-6000-1 (850*600,12 мм), инв. №44016003; Тележка бортовая сетчатые борта ТС-6 (800*1200) (колеса 200Д) – инв. 44403008; Тележка бортовая сетчатые борта ТС-6 (800*1200) (колеса 200Д) – инв. 44403009; Тележка бортовая сетчатые борта ТС-6 (800*1200) (колеса 200Д) – инв. 44403010; Тележка электрическая НС CBD15-AMC-1-I (Китай) (инв. 44190020); Широколенточный шлифовальный станок Б/У BULDOGRR/RC 2010 г. в., инв. 44502017; Промышленный пылесос LSU395 (инв. 41602038); Фильтр рукавный ФРН-16Н компл. 2 (инв. 41602035); Система аспирации на участке МФ (50426294); Система аспирации – Ф-л № 2 (инв. 41602027); Линия автоматической оптимизации ОПТИМА 10 (44500007) | Минская обл., Логойский р-н, г. п. Плещеницы, ул. Чапаева, 40 | 224916,59 | 2249,17 | 11245,83 |

В отношении лота № 2051 проводятся третьи повторные торги. **Стоимость снижена на 20 %.**
Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» от 31.05.2025.
В отношении лота № 2083 проводятся вторые повторные торги. **Стоимость снижена на 15 %.**
Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» от 11.06.2025

В отношении частей лота № 2051 имеется ограничение (обременение) в виде залога (залогодержатель – ОАО «Приорбанк»). Подробная информация по телефону +375293110464 (Анастасия)

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **16 июля 2025 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 2 июля 2025 года до 16.00 15 июля 2025 года |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901. Задаток для участия в торгах по Лоту ___, ООО «Профитсистем», проводимых 16.07.2025.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127.
Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.
Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.
**Вознаграждение аукциониста: по лоту № 2051 – 3,5 %, по лоту № 2083 – 5 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов осуществляется согласно договору купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Сергей, тел. +375295295202 (пн – пт с 10.00 до 13.00).**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ООО «Профитсистем», в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375173958917 (220040, г. Минск, ул. Достоевского, 27)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

## Складнікі нашай незалежнасці: упэўненасць у заўтрашнім дні

НА СТАРЦЕ

# ПАДЗЯКА І СПАДЗЯВАННІ

**Расказваем, як выпускнікі Гродзенскай вобласці плануюць рэалізаваць сябе пасля атрымання дыпломаў**

Лета — цудоўная пара. Аднак для моладзі, якая заканчвае вышэйшыя навучальныя ўстановы і адпраўляецца ў дарослае жыццё, яна яшчэ і асабліва хвалюючая. Праходзяць урачыстыя цырымоніі ўручэння дыпломаў, грымяць выпускныя. Уласны карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з выпускнікамі і даведаўся, як і дзе яны плануюць будаваць сваю будучыню.



У мінулыя выхадныя Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт праводзіў у дарослае жыццё маладых урачоў. Свята было і ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы, дзе адбыўся 15-ы выпуск афіцэраў ваеннага факультэта. Выпуск супаў з 20-годдзем заснавання ваеннага факультэта. Маладыя людзі ахвотна дзяліліся эмоцыямі.

Наталля Траццякова скончыла лячэбны факультэт і будзе працаваць хірургам у Гомельскай гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі:

— Месцам працы вельмі задаволеная, з нецярпеннем чакаю, калі пачну свой прафесійны шлях. Навучанне ва ўніверсітэце буду ўспамінаць з вялікай цеплынёй. Дзякуючы студэнцкім гадам пазнаёмілася з мноствам цікавых людзей па ўсёй Беларусі. За гады навучання набыла ўпэўненасць у сабе і сваіх рашэннях. Мной змешаныя, прысутнічае і хваляванне, але ўпэўнена, што ў мяне ўсё атрымаецца!

Эмоцыі перапаўнялі і Арцёма Капыціча, які ў 2022 годзе заваяваў званне найлепшага студэнта СНД, а ў 2023-м стаў найлепшым маладым вучоным СНД. Малады чалавек скончыў лячэбны факультэт.

— Урачом вырашыў стаць у 12 гадоў. Тады ў мяне здарылася сур'ёзная траўма рукі, дактары зрабілі ўсё, каб дапамагчы мне. Менавіта тады ў душы нешта адгукнулася. Я з захапленнем назіраў за работай медыкаў. Буду працаваць у Мінскай абласной бальніцы ўрачом — траўматолагам-артапедам. Я вельмі рады і ўдзячны ўніверсітэту за тое, што мне далі магчымасць паказаць сябе не толькі на ўзроўні ўніверсітэта, але і на міжнароднай арэне. На дасягнутым спыняцца не планую, хачу развівацца ў прафесіі, прасоўвацца па кар'ернай лесвіцы, а таксама расці як вучоны.

Выпускніца лячэбнага факультэта Аляксандра Целеш будзе працаваць акушэрам-гінеколагам у 3-й гарадской клінічнай бальніцы імя А. У. Клумава г. Мінска. Шлях у прафесію пачаўся ў школе з любові да біялогіі:

— У 11 класе я была ва ўніверсітэце на дні адчыненых дзвярэй. Тады мне ўдалося зрабіць лёгачную рэанімацыю, і ў гэты момант канчаткова вырашыла, што хачу быць урачом. Усе шэсць гадоў я не збочвала з абранага шляху і старанна вучылася, і вось я выпускніца. Мне вельмі падабаецца працаваць з дзецьмі. У мяне быў досвед работы ў Гродзенскім абласным клінічным перынатальным цэнтры. Паглядзела на работу ўрача — акушэра-гінеколага знутры і зразумела, што жадаю прымаць у гэты свет новыя жыцці. Ты нясеш адказнасць адразу за дваіх — гэта вельмі крута, разам з тым гэта магчымасць назіраць самы трапяткі момант у жыцці любой жанчыны.

Антон Чайчыц скончыў Купалаўскі ўніверсітэт з чырвоным дыпломам. Малады чалавек паступіў ва ўніверсітэт не адразу. Спачатку служыў па кантракце, а потым вырашыў будаваць кар'еру далей:

— Да вучобы падыходзіў адказна, старанна вучыўся, таму складанасцяў не ўзнікала. Калі рабіць усё своечасова, паступова ісці да мэты, то і шлях будзе камфортным. Для навучання выбраў спецыяльнасць «Фізічная падрыхтоўка ваеннаслужачых». З дзяцінства мне быў цікавы спорт, добра даваліся нават складаныя фізічныя нагрузкі. Пачынаецца новы цікавы этап! Я застаюся ў Гродне, буду служыць у 62-м зенітна-ракетным палку — на карысць Радзіме. Для гэтага маю магчымасці. Я ўдзячны сваім бацькам і настаўнікам за падтрымку і веру ў мяне. Яны заўсёды казалі мне аб важнасці быць патрыётам і любіць сваю Радзіму. Гэтыя словы натхнялі на працягу ўсяго навучання.

Асаблівым гэты дзень стаў і для Цімафея Лукашова, які вучыўся на спецыяльнасці «Тылавое забеспячэнне войскаў»:

— Сённяшняя падзея для мяне — нагода для радасці і гонару. Я доўга вучыўся, і часам было нялёгка, але рады, што ўсё атрымалася менавіта так. Выбраў шлях, які быў мне блізкі і зразумелы. Працягнуў справу бацькі, таму што заўсёды адчуваў глыбокую сувязь з гэтай прафесіяй. Ваенная справа — не проста работа, гэта прызванне, якое патрабуе поўнай самааддачы і адданасці Радзіме. Патрыятызм — гэта частка мяне. Хачу служыць сваёй краіне, рабіць унёсак у яе бяспеку і росквіт. У далейшым буду праходзіць службу ў адной з вайсковых часцей горада Гомеля. Упэўнены, што мяне чакае цікавы шлях!

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ.**
**Фота ГрДМУ.**


**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»** (Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных электронных торгов по комбинированной схеме
(на повышение и понижение цены движимого имущества)
по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Газпром трансгаз Беларусь»** (Продавец) на праве собственности

**Электронные торги проводятся 16.07.2025 в 14.00.**

**Лот № 1:** Межсетевой экран Check Point 6600 Appliance-Base, инв. № 100000104271. 2021 г. в. Адрес: Минская обл., Минский р-н, аг. Михановичи.
**Лот № 2:** Межсетевой экран Check Point 6600 Appliance-Base, инв. № 100000104272. 2021 г. в. Адрес: Минская обл., Минский р-н, аг. Михановичи.
**Лот № 3:** Межсетевой экран Check Point 3200 Next CPAPSG3200, инв. № 100000104530. 2019 г. в. Адрес: Брестская обл., Каменецкий р-н, д. Волчин.
**Лот № 4:** Межсетевой экран Check Point 3200 Next Generation, инв. № 100000104531. 2019 г. в. Адрес: Брестская обл., Каменецкий р-н, д. Волчин.
**Лот № 5:** Межсетевой экран Check Point 3200 Next CPAP, инв. № 100000104532. 2019 г. в. Адрес: Брестская обл., г. Кобрин, ул. Дзержинского, 135.
**Лот № 6:** Межсетевой экран Check Point 3200 Next, инв. № 100000104533. 2019 г. в. Адрес: Брестская обл., г. Кобрин, ул. Дзержинского, 135.
**Лот № 7:** Межсетевой экран Check Point 1550 Next Generation, инв. № 100000104231. 2021 г. в. Адрес: Гомельская обл., Гомельский р-н, Урицкий с/с, 1.
**Лот № 8:** Межсетевой экран Check Point 1550 Next Generation, инв. № 100000104232. 2021 г. в. Адрес: Гомельская обл., Гомельский р-н, Урицкий с/с, 1.
**Лот № 9:** Сервер управления Check Point Smart-1 5050 Next, инв. № 100000104259. 2021 г. в. Адрес: г. Минск, ул. Некрасова, 9.
**Лот № 10:** Сервер управления Check Point Smart-1 5050 Next, инв. № 100000104260. 2021 г. в. Адрес: г. Минск, ул. Некрасова, 9.
**Лот № 11:** Межсетевой экран Check Point 3600 Base Appliance, инв. № 100000104261. 2021 г. в. Адрес: г. Минск, ул. Некрасова, 9.
**Лот № 12:** Межсетевой экран Check Point 3600 Base Appliance, инв. № 100000104262. 2021 г. в. Адрес: г. Минск, ул. Некрасова, 9.
**Лот № 13:** Межсетевой экран Check Point 1550 Next Generation, инв. № 100000104235. 2021 г. в. Адрес: Гомельская область, Мозырский район, Козенский сельсовет, 1, А1.
**Лот № 14:** Межсетевой экран Check Point 1550 Next Generation, инв. № 100000104233. 2021 г. в. Адрес: Гомельская область, Мозырский район, Козенский сельсовет, 1, А1.
**Лот № 15:** Межсетевой экран Check Point 1550 NextGeneration W, инв. № 100000104077. 2021 г. в. Адрес: Минская обл., г. Молодечно, ул. Л. Роменская, 165.
**Лот № 16:** Межсетевой экран Check Point 1550 NextGeneration W, инв. № 100000104076. 2021 г. в. Адрес: Минская обл., г. Молодечно, ул. Л. Роменская, 165.
**Лот № 17:** Межсетевой экран CheckPoint3600Base Appliance with, инв. № 100000104445. 2021 г. в. Адрес: г. Минск, ул. Независимости 117А.
**Лот № 18:** Межсетевой экран CheckPoint3600 Base Appliance with, инв. № 100000104446. 2021 г. в. Адрес: г. Минск, ул. Мележа 1.
**Лот № 19:** Межсетевой экран Check Point 3600 Base Appliance, инв. № 100000104241. 2021 г. в. Адрес: г. Минск, ул. Ф. Скорины, 4.
**Лот № 20:** Межсетевой экран Check Point 3600 Base Appliance, инв. № 100000104239. 2021 г. в. Адрес: г. Минск, ул. Ф. Скорины, 4.
**Лот № 21:** Межсетевой экран Check Point 1550 Next Generation, инв. № 100000104246. 2021 г. в. Адрес: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большой Тростенец, ул. Западная, 9.
**Лот № 22:** Межсетевой экран Check Point 1550 Next Generation, инв. № 100000104247. 2021 г. в. Адрес: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большой Тростенец, ул. Западная, 9.

**Начальная цена с НДС 20 % по Лотам №№ 1–2** – 76 680,00 руб. **Минимальная цена с НДС 20 % по Лотам №№ 1–2** – 69 012,00 руб. **Задаток по Лотам №№ 1–2** – 7 668,00 руб. Шаг электронных торгов на повышение – 5 % от начальной цены (3 834,00 руб.). Шаг электронных торгов на понижение – 5 % от начальной цены (3 834,00 руб.).

**Начальная цена с НДС 20 % по Лотам №№ 3, 5** – 22 320,00 руб. **Минимальная цена с НДС 20 % по Лотам №№ 3, 5** – 20 088,00 руб. **Задаток по Лотам №№ 3, 5** – 2 232,00 руб. Шаг электронных торгов на повышение – 5 % от начальной цены (1 116,00 руб.). Шаг электронных торгов на понижение – 5 % от начальной цены (1 116,00 руб.).

**Начальная цена с НДС 20 % по Лотам №№ 4, 6** – 24 480,00 руб. **Минимальная цена с НДС 20 % по Лотам №№ 4, 6** – 22 032,00 руб. **Задаток по Лотам №№ 4, 6** – 2 448,00 руб. Шаг электронных торгов на повышение – 5 % от начальной цены (1 224,00 руб.). Шаг электронных торгов на понижение – 5 % от начальной цены (1 224,00 руб.).

**Начальная цена с НДС 20 % по Лотам №№ 7, 8, 13–16, 21, 22** – 2 040,00 руб. **Минимальная цена с НДС 20 % по Лотам №№ 7, 8, 13–16, 21, 22** – 1 836,00 руб. **Задаток по Лотам №№ 7, 8, 13–16, 21, 22** – 204,00 руб. Шаг электронных торгов на повышение – 5 % от начальной цены (102,00 руб.). Шаг электронных торгов на понижение – 5 % от начальной цены (102,00 руб.).

**Начальная цена с НДС 20 % по Лотам №№ 9, 10** – 108 720,00 руб. **Минимальная цена с НДС 20 % по Лотам №№ 9, 10** – 97 848,00 руб. **Задаток по Лотам №№ 9, 10** – 10 872,00 руб. Шаг электронных торгов на повышение – 5 % от начальной цены (5 436,00 руб.). Шаг электронных торгов на понижение – 5 % от начальной цены (5 436,00 руб.).

**Начальная цена с НДС 20 % по Лотам №№ 11, 12, 17–20** – 10 920,00 руб. **Минимальная цена с НДС 20 % по Лотам №№ 11, 12, 17–20** – 9 828,00 руб. **Задаток по Лотам №№ 11, 12, 17–20** – 1 092,00 руб. Шаг электронных торгов на повышение – 5 % от начальной цены (546,00 руб.). Шаг электронных торгов на понижение – 5 % от начальной цены (546,00 руб.).

Срок для подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней со дня проведения электронных торгов (после предъявления Продавцу платежного документа, подтверждающего оплату вознаграждения Организатора электронных торгов).

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП) и Правилами проведения электронных торгов по комбинированной схеме, размещенными на детальной странице лота на ЭТП. Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **14.07.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by. Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

КОНКУРС

# «МЫ — ПАМЯТАЕМ!»

## Работнікі прадпрыемстваў Мінпрама спявалі песні ваенных гадоў

Праходзяць гады, мінаюць дзесяцігоддзі, аднак, колькі б ні прайшло часу, у нашых сэрцах пякучым і нясцерпным болем будзе адгукацца тэма Вялікай Айчыннай вайны... Яе гарачае і бязлітаснае полымя апякло кожны дом, кожную сям'ю. Вось ужо 80 гадоў мы жывём і працуем пад мірным і шчаслівым небам і нізка схіляем галовы перад бясстрашнымі подзвігамі нашых дзядоў і прадзедаў, якія набліжалі светлы Дзень Перамогі. Гэта стала лейтматывам конкурсу песні ваенных гадоў «Я, мы — памятаем!» сярод прадпрыемстваў Міністэрства прамысловасці, які праходзіў на базе Палаца культуры Мінскага аўтамабільнага завода.



Гэты конкурс з'яўляецца ўнікальным творчым праектам, а яго арганізатары і ідэйныя натхняльнікі — аб'яднаная арганізацыя Беларускага саюза жанчын Міністэрства прамысловасці, а таксама Беларускі прафесійны саюз работнікаў галін прамысловасці «БЕЛПРАФМАШ».

Сёлета ўдзел у мерапрыемстве ўзялі 15 каманд, якія прадстаўлялі вядучыя прадпрыемствы галіны: БЕЛАЗ, МАЗ, МТЗ, «АМКАДОР», «Гомсельмаш», «Атлант», «ІНТЭГРАЛ» і «БЕЛКАМУНМАШ». Сваім сцэнічным майстэрствам таксама дзяліліся артысты Мінскага завода шасцерняў, Мінскага гадзіннікавага завода, Мінскага электратэхнічнага завода імя В. І. Казлова, Мінскага маторнага завода, Магілёўскага завода ліфтавага машынабудавання, «Бабруйскаграмаша» і «Лідсельмаша».

Мілагучна ліліся са сцэны песні, якія не страчваюць актуальнасці і закранаюць глыбокія струны душы. Нікога не пакінулі раўнадушным яркія харэаграфічныя кампазіцыі. Многія гледачы не маглі стрымаць слёз. Вызначыць пераможцаў журы было вельмі нялёгка.

Так, ганаровае трэцяе месца занялі самадзейныя артысты ААТ «Мінскі электратэхнічны завод імя В. І. Казлова», другое месца прысуджана артыстам ААТ «Гомсельмаш», а пераможцамі конкурсу прызнаны артысты ААТ «ІНТЭГРАЛ — кіруючая кампанія холдынга «ІНТЭГРАЛ». Узнагародамі для выканаўцаў сталі дыпломы, памятныя падарункі і мноства незабыўных уражанняў, перажытых на сцэне. І артысты, і гледачы на некаторы момант вярнуліся на дзесяцігоддзі назад і адчулі нясцерпны душэўны боль матуль, якія адпраўлялі сыноў на фронт, бясконцае імкненне да Перамогі разам з нашымі байцамі... І зноў сэрца кожнага напоўнілася шчырай падзякай пакаленню пераможцаў за тое, што мы жывём пад мірным небам.

**Святлана СІЛЬВАНОВІЧ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

СПАДЧЫНА

# АРХІТЭКТУРНЫ КОД МІНСКА

## Аўтарскія ідэі пераўтварэння сталіцы

Іх можна знайсці ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, дзе працуе выставачны праект «Хранатоп сталічных метамарфоз», прымеркаваны да Года добраўпарадкавання і Дня Незалежнасці.



У цэнтры ўвагі экспазіцыі — архітэктурнае развіццё і змяненне Мінска з пачатку мінулага стагоддзя і да сённяшняга дня. Прадстаўлена больш за 200 экспанатаў, сярод якіх самыя разнастайныя кніжныя выданні, фотаздымкі, мастацкія работы, копіі сучасных скульптур, схемы сканструяваных, рэалізаваных і запланаваных архітэктурных аб'ектаў для добраўпарадкавання гарадскога асяроддзя.

Напрыклад, свае работы прадставілі навучэнцы Гімназіі-каледжа мастацтваў імя І. В. Архэмчыка, Мінскага дзяржаўнага каледжа архітэктуры і будаўніцтва, а таксама Мінскай дзяржаўнай гімназіі-каледжа мастацтваў. Экспанаты выразна дэманструюць, якой успрымаюць сталіцу юныя мінчане праз прызму ўласных пачуццяў і эмоцый. Тут і карціны з любімымі вулачкамі горада, і макеты, зробленыя ўласнаручна з паперы, пластыку, кардону і дрэва. Яшчэ можна ўбачыць 3D-мадэлі ветак метро, зробленых у стылі Марка Шагала, знакамітыя «Вароты Мінска»...

Сярод макетаў ужо існуючых будынкаў сталіцы прадставілі ўласныя распрацоўкі студэнты: мадэлі дамоў, 3D-карту мікрараёна «Пантано» з некалькімі жылымі секцыямі, стадыёнам, дзіцячым садком, школай і спартыўным комплексам. А праектная кампанія «VIASET» паказала новыя, свежыя і неардынарныя рашэнні. Яшчэ да ўвагі — паменшаныя версіі скульптур Максіма Пятрулі.

— Дзякуючы падобнаму тандэму атрымаўся каларытны і захапляльны праект, які здолеў спалучыць студэнтаў з іх крэатыўнымі і смелымі ідэямі і архітэктурныя кампаніі, якія могуць даць карысныя парады навучэнцам мастацкіх устаноў адукацыі, — адзначае **загадчык сектара праектна-выставачнай дзейнасці, аддзела галерэйна-выставачнай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Аліна ФЕДАРАШЫНА.**

Дапоўнена выстаўка кніжным фондам Нацыянальнай бібліятэкі, які налічвае каля 5 тысяч кніг па архітэктуры. Так, у вітрыне «Будучыня архітэктуры: позірк у заўтрашні дзень» выклікае цікавасць кніга архітэктара Міхаіла Асмалоўскага, дзе прадстаўлены праекты, якія хацелі ўвасобіць у Мінску ў пасляваенныя гады, аднак не здолелі рэалізаваць.

Выстаўка аб'ядноўвае гісторыю, мастацтва і архітэктуру ў розных іх праявах, а таксама расказвае пра людзей, якія шмат усяго распрацавалі і рэалізавалі ў нашай краіне, кім мы па-сапраўднаму можам ганарыцца і нават натхняцца. Перакапацца ў гэтым можна, завітаўшы на выстаўку ў **Нацыянальную бібліятэку Беларусі** да 25 жніўня.

**Анжаліка СЦЕФАНОВІЧ,**
**фота аўтара.**

## Надвор'е на заўтра

| Горад | Ціск | Ноччу | Днём |
| --- | --- | --- | --- |
| МІНСК | 760 мм рт.сл. | +14..+19°C | +28..+31°C |
| ВІЦЕБСК | 759 мм рт.сл. | +15..+16°C | +27..+29°C |
| МАГІЛЁЎ | 760 мм рт.сл. | +15..+17°C | +27..+29°C |
| ГОМЕЛЬ | 761 мм рт.сл. | +15..+16°C | +27..+29°C |
| ГРОДНА | 765 мм рт.сл. | +17..+20°C | +32..+34°C |
| БРЭСТ | 762 мм рт.сл. | +17..+19°C | +32..+35°C |

### Месяц

*Першая чвэрць 02.07—09.07. Месяц у сузор'і Шаляў.*

### Геамагнітныя ўзрушэнні




Абазначэнні:
- — няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
- — невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
- — слабая геамагнітная бура
- — малая геамагнітная бура

Паводле даных Белгідрамета

### ...у суседзяў

МАСКВА +25..+27°C

С.-ПЕЦЯРБУРГ +26..+28°C

## 2 ЛІПЕНЯ Даты Падзеі Людзі

У краіне

**1717** год — пачала дзейнічаць шкляная мануфактура ў мястэчку Налібакі, што належала князям Радзівілам. Адна з найстарэйшых мануфактур у Беларусі. Створана на высокім тэхнічным узроўні на ўзор Дрэздэнскай мануфактуры. Тут варылі крышталь і шкло самых розных колераў, шліфавалі, эмаліравалі, залацілі звычайны і дэкаратыўны посуд.

**1909** год — нарадзіўся Ціхан Піменавіч Бумажкоў, арганізатар і кіраўнік партызанскага руху на беларускім Палессі ў гады Вялікай Айчыннай вайны; першы партызан, які быў уганараваны званнем Героя Савецкага Саюза (6 жніўня 1941 года). Загінуў пры выхадзе з акружэння ў баі ў лістападзе 1941 года ў раёне вёскі Аржыца Палтаўскай вобласці.

**1913** год — у Магілёве заснаваны настаўніцкі інстытут; у 1918 годзе пераўтвораны ў Магілёўскі педагагічны інстытут, цяпер — Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Аркадзя Куляшова.

У свеце

**1925** год — нарадзіўся Патрыс Лумумба, першы прэм'ер-міністр незалежнай Рэспублікі Конга, былога Бельгійскага Конга, паэт і адзін з сімвалаў барацьбы народаў Афрыкі за незалежнасць. Заснавальнік (1958 г.) і кіраўнік партыі Нацыянальны рух Конга (НРК).

**1990** год — адкрыўся XXVIII з'езд КПСС — апошні афіцыйны з'езд у гісторыі партыі.

**1993** год — заснаваны Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж». У яго ўваходзяць: ландшафтна-пейзажны парк, палацрэзідэнцыя князёў Радзівілаў, гарадская ратуша з гандлёвымі радамі, гарадская (Слуцкая) брама, адміністрацыйны корпус (будынак былога заезджага двара) — помнік архітэктуры XIX ст. і выставачная зала на тэрыторыі былога калегіума езуітаў. У 2005 годзе архітэктурна-культурны комплекс рэзідэнцыі роду Радзівілаў у Нясвіжы ўключаны ў спіс аб'ектаў сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні міністру юстыцыі Рэспублікі Беларусь Яўгену Іосіфавічу Каваленку ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні міністру юстыцыі Рэспублікі Беларусь Каваленку Яўгену Іосіфавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

Наступны нумар выйдзе ў суботу, 5 ліпеня 2025 года.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12 275. Індэкс 63850. Зак. № 1507.

Нумар падпісаны ў 19.30 1 ліпеня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12